Адзін сыцее — дзесяць пацее. *(Прымаўка)* Было ў бацькі два сыны. *(А. Якімовіч)* У кія два канцы і абодва б'юць. *(Ф. Янкоўскі)* Усе чацвёра хлопцаў скончылі васьмігодку сёлетняй вясной. *(І. Навуменка)* З дзесятага класа пайшло на фронт шаснаццаць, прыйшло толькі чацвёра. *(І. Навуменка)* Пераезд сціх. За лініяй чыгункі ў траншэі стаілася яго чацвёра абаронцаў. *(В. Быкаў)* Праз хвіліну яму ўжо добра было відаць, што ідуць двое людзей. *(К. Чорны)* А з дзецьмі ён абыходзіцца горай, як з якой жывёлаю. Двое з яго пабояў ужо ляглі ў труну, трое аглухлі, а пяцёра ляжаць у пасцелі. *(К. Крапіва)* Два галубы купаюцца ў праменнях, цвітуць, абняўшыся, дзве вішні ля акна. *(А. Александровіч)* У адным мяшку два каты не пагодзяцца. *(Ф. Янкоўскі)* У Пасадні былі дзве карчмы. *(З. Бядуля)* Два сне-

гіры, дзве кропелькі зары — на мокрую галінку вольхі ўпалі. *(Н. Мацяш)* Дзве дзявочыя постаці мільганулі на фоне лугавой зяляніны. *(Т. Хадкевіч)* Два чалавекі сядзяць у чоўне. *(Я. Колас)* Два свісты прарэзалі мрок. *(Я. Колас)* У пратаколе было чатыры пункты. Чалавек з пятнаццаць прыйшло. Два браты пайшлі на раку купацца, а трэці на беразе валяецца. *(Коромысло и ведра)*

3. Познакомьтесь с различными способами и формами выражения приблизительного количества в белорусском языке и сравните их с аналогичными выражениями в русском языке.

I. Ён досыць высока, сажняў на тры, а можа і болей узнімаецца над вадою. *(Я. Колас)* У бясхвостых земнаводных заднія канечнасці звычайна ў 1,5—3 разы даўжэйшыя за пярэднія. *(М. Пікулік)* Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску налічвалася 400 вуліц і жыло каля 250 тысяч жыхароў. *(У. Карпаў)* Каля сотні рабочых працавала на пабудове дома. *(Я. Колас)* Гадоў чатыры таму назад каля Крышыч цэлае лета працавала вялікая група геалагічнай разведкі... *(У. Крайчанка)* Кіламетраў за тры ад лесу зелянеюць на полі прысады. *(М. Лынькоў)* Нарэшце пісьмо прыйшло: як выявілася, нейкія 100 км яно ішло пяць дзён. *(І. Шамякін)* Янукевічу было гадоў пад пяцьдзесят. *(Т. Хадкевіч)* А збоку крокаў якіх за 200 зноў былі відаць кусты. *(І. Чыгрынаў)* Больш 4-х гадзін блукалі дзеці па схілах Гаруноўскіх узвышшаў... *(У. Крайчанка)* Разоў тры ці чатыры Язэп пытаўся ў сустрэчных пра дарогу на Нёман. *(А. Якімовіч)* Да горада было кіламетраў 3—4. *(М. Лынькоў)* Тым дубкам па 15 гадкоў, а мне — пад 60. *(У. Мяжэвіч)* Праўда, ён не так і бедны: грошай мае рублёў тры ды дзве грывенькі з гары і трояк яшчэ той медны. *(Я. Колас)* Але прайшло якіх са дзве хвіліны, як я ўжо асвоілася і стала разглядаць усё наўкола. *(Я. Колас)* Пасля паўдня 22 ліпеня настаўнікі, якіх было каля 25 чалавек, невялічкімі групкамі і рознымі сцежкамі пацягнуліся ва ўмоўленае месца на бераг Нёмана, вярсты за чатыры ад сяла *(Я. Колас)* Вучняў было з 30, а па спіску 107. *(Я. Колас)* На ўсю вёску і на ўсе хутары (іх вакол вёскі з дваццаць) толькі адна хата-мураванка. *(Ф. Янкоўскі)* Нядзелек за год — за пяцьдзесят. *(Ф. Янкоўскі)* Ён амаль пяць кіламетраў поўз з сваімі сябрамі. *(К. Крапіва)*

II. Якіх дваццаць — дваццаць два будзе яму. Пера-

ход быў кіламетраў за дваццаць. Яму гадоў за шэсцьдзесят. Ты ж гадоў на пяць старэйшы за Пятра. Гады з чатыры не было. Мне ўжо пад восемдзесят, а старому за дзевяноста! Нешта каля ста пяцідзесяці ці што. Александрыйская бібліятэка ў Старажытным Егіпце налічвала каля 700 тысяч тамоў. Вышыня дуба 42 метры, а гадоў яму больш за 650. А гэта больш за дзве тысячы каштуе. Гэтай секвоі штось каля 4 тысяч год. Нарыхтавалі больш за 200 тон сена. Ён — аўтар 14 кніг і брашур, больш 100 значных артыкулаў і каля 500 заметак і паведамленняў. У 24-м ці 25-м годзе прадаў хату ў вёсцы і перабраўся ў горад.

Урок 5

ВЫРАЖЕНИЕ СКАЗУЕМОГО

Сказуемое в белорусском, как и в русском, языке обычно выражается глаголом и по существу одинаково в обоих языках. Оно может быть как простым, так и составным. Отличия касаются в основном составного сказуемого, но имеются некоторые особенности и простого глагольного сказуемого.

Специфически белорусским является сказуемое, выраженное сложной формой прошедшего времени, состоящей из основного глагола и вспомогательного *быць* в прошедшем времени: *Дождж быў пайшоў, але хутка спыніўся.* Необходимо обратить внимание, что в этом случае вспомогательный глагол *быць* согласуется в роде и числе с подлежащим, как и основной: *ён быў зрабіў, яна была зрабіла, яно было зрабіла, яны былі зрабілі.* Как видно, такое сказуемое обозначает прерванное действие в прошлом, которое сменяется другим действием.

В именном составном сказуемом, когда основное лексическое значение выражается именем существительным, прилагательным, числительным или местоимением, наряду с общей для обоих языков глагольной связкой *быць* могут употребляться также глаголы *з'яўляцца* — являться, *станавіцца* — становиться, *звацца* — зваться, называться, *рабіцца* — делаться, *стаць* — стать, *лічыцца* — считаться и др. Обычно при этих глаголах именная часть ставится в творительном падеже: *Васіль будзе студэнтам. Васіль з'яўляецца студэнтам (Васіль ёсць студэнт, Васіль — студэнт). Васіль становіцца (стане, стаў) студэнтам. Васіль робіцца студэнтам. Васіль лічыцца студэнтам* и т. д. При этом фактически только фразы со

связками *быць* и *з'яўляцца* полностью тождественны по значению. Другие связки вносят определенные дополнительные значения. Так, вспомогательные глаголы *рабіцца, станавіцца* указывают обычно на начало приобретения какого-либо свойства, связка *лічыцца* вносит оттенок условности, мнимости какого-либо свойства или состояния.

Для такого типа сказуемого характерен пропуск не только глагольной связки *быць* в настоящем времени, но и *з'яўляцца: Настаўнікам Васіль тут. Ён тут галоўным гандляром.* Часто вместо творительного падежа имени в том же значении употребляются конструкции с предлогом *за* и винительным падежом: *Васіль тут за настаўніка. Ён тут за галоўнага гандляра.* Такая же конструкция употребляется и со вспомогательным глаголом *быць: Яна была за афіцыянтку.* Важно подчеркнуть, что конструкция с предлогом *за* чаще всего имеет значение 'быть кем-то' и только в отдельных контекстах — 'быть вместо кого-то': *Даніла стаў яму за бацьку. Суседка была ім за маці.*

При глагольных связках *зваць, быць, стаць* и некоторых других нередко употребляется наряду с творительным и именительный падеж: *Яе завуць Алесяй.— Яе завуць Алеся. Асіна бывае прыгожай восенню.— Асіна бывае прыгожая восенню.* Именительный падеж предпочтителен при сравнительной степени прилагательных: *Ён быў старэйшы і вышэйшы ростам. Тон стаў павольнейшы і мякчэйшы. Тады ён быў маладзейшы і дужэйшы.*

В составном сказуемом прилагательные и причастия, как правило, употребляются в полной форме: *Яна была вясёлая і жартаўлівая. Я быў хворы. Камандзір быў паранены.* Краткие формы допускаются в тех случаях, когда прилагательные и причастия имеют модальное значение (*готовы, абавязаны, вымушаны, схільны* и т. д.): *Гэты прадмет мне патрэбен. Я быў вымушан гэта зрабіць. Яму ён абавязан усім.* Если краткая форма односложная, то в составе сказуемого предпочтение отдается полной форме: *Ён быў смелы. Поле было белае. Салдат варты ўзнагароды.* Притяжательные прилагательные в качестве сказуемого выступают только в краткой форме: *Гэта кніга сынава. Гэты дом сынаў. Гэта поле сынава.* Встречающиеся иногда в художественной литературе полные формы (типа *паход Ігаравы, матчыныя слёзы*) нельзя считать правильными.

Следует отметить специфически белорусские формы прилагательных, имеющих относительное значение качества, выражаемое приставкой *за-: Гэты пакой замалы для работы* (слишком мал, маловат). *Праход быў завузкі* (узковат, слишком узок).

В качестве сказуемого страдательные причастия прошедшего времени мужского рода могут быть как краткие, так и полные, но предпочтение должно отдаваться полным формам: *Дакумент прызначаны для выканкома.— Дакумент прызначан для выканкома.* Причастия женского и среднего рода, а также во множественном числе обычно употребляются в краткой форме: *Справа адаслана ў выканком. Жыта патоптана коньмі. Участкі агароджаны.* Если же такие причастия имеют пояснительные слова, то они могут быть и полной формой: *Дзверы былі толькі прычыненыя. Пшаніца сёння зжатая.*

Причастия на *-ш-, -ўш-* (диалектное *Мы не прывыкшыя да працы*), встречающиеся в художественной литературе, не соответствуют литературной норме. В некоторых случаях возможна их замена причастиями на *-л-*, которые вполне отвечают норме: *Двор цяпер зусім запусцеўшы.— Двор цяпер зусім запусцелы. Ён быў прамокшы да ніткі.— Ён быў прамоклы да ніткі.* Не стали литературной нормой также составные сказуемые, у которых при глагольной связке употребляются деепричастия прошедшего времени на *-ўшы: Ён быў толькі ўстаўшы з пасцелі. Ён быў добра выпіўшы. Яна пайшоўшы была.* Однако в художественной литературе в качестве характеристики речи действующих лиц такие формы вполне уместны.

В белорусском языке широко представлены глагольные и именные сказуемые с глагольными связками *стаца* — стать и *мецца* — иметь намерение: *Ты стаўся нам родны і блізкі; Мясціны сталіся блізкімі і дарагімі; Ён меўся пайсці начаваць; Кафедра мелася рэкамендаваць яго ў аспірантуру.*

Определенным своеобразием характеризуются также составные сказуемые, у которых именная часть выражена наречием *нішто* или выражением *нішто сабе: Гаспадарка была нішто. Яна была нішто сабе.* Эти и подобные фразы обычно означают наличие положительного качества у лица или предмета, выступающего в качестве подлежащего (достаточно хороший, неплохой)

СЛОВА И ВЫРАЖЕНИЯ

По́шта — почта.

Тэлегра́ф — телеграф.

Телефо́н — телефон.

Авіяпо́шта — авиапочта.

Піса́ць на а́драс — писать по адресу.

Адраса́т, атрыма́льнік — адресат, получатель.

Адпра́ўшчык — отправитель.

Зваро́тны, адваро́тны а́драс — обратный адрес.

Пашто́вы і́ндэкс — почтовый индекс.

Пісьмо (ліст) да запатрабава́ння — письмо до востребования.

Атрыма́ць (пасла́ць) пісьмо́, ліст — получить (послать) письмо.

Пашто́ўка — открытка, открытое письмо.

Віншава́льная пашто́ўка — поздравительная открытка.

Канве́рт — конверт.

Пашто́вая скры́нка — почтовый ящик.

Апусці́ць (кі́нуць) ліст у пашто́вую скры́нку — опустить письмо в почтовый ящик.

Заказно́е пісьмо́ (заказны́ ліст) — заказное письмо.

Пасыла́ць заказны́м — посылать заказным.

Накле́іць дадатко́вую ма́рку — наклеить дополнительную марку.

Пішы́це пра́вільна а́драс! — Пишите правильно адрес!

Ха́тні (дама́шні), службо́вы а́драс — домашний, служебный адрес.

Пашто́вая папе́ра — почтовая бумага.

Бандэро́ль — бандероль.

Про́стая (заказна́я) бандэро́ль — простая (заказная) бандероль.

Пасы́лка про́стая, заказна́я, з аб'яўленай цэ́ннасцю — посылка простая, заказная, с объявленной ценностью.

Пашто́вы перавод — почтовый перевод.

Тэлегра́фны перавод — телеграфный перевод.

Аддзяле́нне су́вязі — отделение связи.

Ха́тні (дама́шні), службо́вы тэлефо́н — домашний, служебный телефон.

Вы няпра́вільна набра́лі ну́мар — вы неправильно набрали номер.

У Мі́нску тэлефо́нныя нумары́ шасцізна́чныя — В Минске телефонные номера шестизначные.

Міжгаро́дні тэлефо́н-аўтама́т — междугородный телефон-автомат.

Парале́льны (спа́раны) тэлефо́н — параллельный (спаренный) телефон.

Пазвані́це а шо́стай гадзі́не — позвоните около шести.

Уну́траны тэлефо́н — внутренний телефон.

Міжгаро́дні перагаво́рны пункт — междугородный переговорный пункт.

Дадатко́вы ну́мар — дополнительный номер.

Аўтаматы́чная тэлефо́нная ста́нцыя (АТС) — автоматическая телефонная станция.

Прымі́це тэлефанагра́му — примите телефонограмму.

Віншава́льная тэлегра́ма — поздравительная телеграмма.

Тэрміно́вая тэлегра́ма — срочная телеграмма.

Тэлеграфава́ць — телеграфировать.

Квіто́к (квіта́нцыя) — квитанция.

Ільго́тны (льго́тны) тары́ф — льготный тариф.

Узя́ць (зняць) тру́бку — взять (снять) трубку.

Ве́шаць тру́бку — вешать трубку.

Тэлефо́нны даве́днік — телефонный справочник.

Тэлефо́нны апара́т (тэлефо́н) — телефонный аппарат (телефон).

Гэ́та не тэлефо́нная размо́ва — это не телефонный разговор.

Заказа́ць тэлефо́нную размо́ву — заказать телефонный разговор.

Зняць (паўтары́ць) зака́з — снять (повторить) заказ.

Паклі́каць да тэлефо́на — попросить (позвать) к телефону.

Тэлефо́н і тэлегра́ф пracу́юць кругласу́тачна — телефон и телеграф работают круглосуточно.

Злуча́ць — соединять.

Злуча́ю, гавары́це — соединяю, говорите.

Раз'ядно́ўваю — разъединяю.

Абане́нт не адка́звае — абонент не отвечает.

Тэлета́йп — телетайп.

Тэлефа́кс — телефакс.

Радыётэлефо́н — радиотелефон.

ТЕКСТ

Несцерка

Жыў сабе так Несцерка, меў дзетак шэсцерка. Рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее — не з чага яму пражыць. Вот ён узяў ды й пайшоў к Богу. Ідзе, ажно ідзе Юр'я — залатое сядло.

— Здароў, святы Юр'я!

— Здароў! Хто ты такі?

— А я,— кажа,— Несцерка, маю дзяцей шэсцерка, рабіць лянуюся, красці баюся, папрасіць не пасмею!

— Куды ты ідзеш?

— К Богу!

— Чаго?

— А вот чаго: не з чага мне пражыць, дык пайду к Богу спрашу, чым мне займацца: ці чытаць, ці пісаць, ці з гаршкоў хватаць? А ты куды, святы Юр'я?

— К Богу й я!

— Зачым?

— А пра свае надабнасці!

— Ну, успомні там, святы Юр'я, чым мне займацца?

— Добра, спытаюся!

— Забудзеш, святы Юр'я?

— Не, не, спытаюся!

— Не забудзеш? Дай мне ў заставу сваю залатую страмяну, што не забудзеш!

— А як жа я паеду?

Несцерка ўзяў лазінку, зрабіў страмяну і прывязаў, а залатую ў заставу ўзяў. Паехаў той Юр'я к Богу, а Несцерка дажыдае, пакуль ён вернецца. Тады святы Юр'я распрасіў у Бога пра свае надабнасці і стаў садзіцца на каня. А Бог убачыў лазовую страмяну і пытаецца:

— А дзе твая страмяна?

— А, госпадзі, Несцерка атабраў,— мае дзетак шэсцерка, рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее, з чаго яму пражыць?

— А няхай круціць ды матае і душу пітае!

Юр'я і паехаў. Пад'ехаў ён к Несцерку, той Несцерка пытае:

— А што, святы Юр'я, што табе Бог казаў?

— А во што Бог казаў: «Няхай круціць ды матае і душу пітае!» Ну, дай жа, Несцерка, маю страмяну, што ты ў мяне ўзяў у заставу, залатую!

— А калі я ў цябе яе браў? Я яшчэ сам табе даў стра-

мяну лазовую. Падавай мне яе назад! Во мая страмяна, ля сядла!..

Што той Юр'я набраўся з Несцеркам, але-такі мусіў заплаціць за лазовую страмяну.

Той Несцерка пабег у хату:

— Троху пажытку ёсць, слава Богу! Мне-ткі не напрасна бог сказаў, што як салгу, дык жыў буду і з таго хлеба!

Пражыў тое, што заплаціў яму Юр'я за лазовую страмяну, тады ўзяў і павесіў залатую страмяну на варотах. Ажно едзе пан багаты. Убачыў страмяну, што вісіць на варотах, і кажа свайму кучару:

— Зайдзі, папытайся, ці не ёсць у яго прадажныя сёдлы?

Кучар зайшоў у хату і спрашвае:

— Што, ты сёдлы дзелаеш?

— Дзелаю,— кажа Несцерка,— ды толькі на заказ, патаму я дзелаю сёдлы дарагія — сярэбраныя, залатыя!

Кучар пайшоў і сказаў пану. Той пан злез і стаў дагаварвацца. Дагаварыліся, каб ён здзелаў яму сядло за сто рублёў і з гары-грошы. Узяў Несцерка грошы ды і сядзіць на печы. Прыязджае той пан за сядлом, а ён ляжыць босы на печы.

— Дзе сядло?

— Якое сядло, паночак?

— Ды тое, што я табе даваў грошы.

Несцерка толькі ксціцца:

— А вой, а вой! Якое ў мяне сядло? Я не ўмею лапцей сплесці.

Пан той крычаў, крычаў ды і кажа:

— Адзявайся, пойдзем на суд!

А Несцерка кажа:

— А што, ці я босы пайду?

— Ах д'яблы яго вазьмі! Кучар, дай яму мае валенцы! Ну, адзявайся, пойдзем!

— А што, ці я голы пайду?

— А нех ці, пане, д'яблы ўзялі! Дай яму, кучар, маю хутру!

Кучар прынёс хутру, Несцерка абуўся, адзеўся. Выйшлі вон. Пан стаў садзіцца на каня. А Несцерка паглядзеў ды кажа:

— А што я, ці сабака, ці што, што я пяшком пабягу!

— А нех ці д'яблы, пане, узялі! Дай яму, кучар, прысцяжнога каня!

Сеў той Несцерка, і паехалі на суд. Прыехалі туды. Сталі іх судзіць.

— Ну, што ты, Несцерка, грошы пану не аддаеш?

— Ды я ж яму не вінават! Ён ка мне вяжацца, сам не ведаю чаго. Хоча, мусіць, сарваць што-небудзь! Зараз скажа, што гэта і боты яго на мне!

Пан той кажа:

— Дурань ты! Дык гэта ж мае боты!

— Ну во, бачыце! Ён во кажа, што боты яго на мне. Можа, ён скажа, што і хутра гэта яго!

Пан зноў:

— Ах, каб цябе д'яблы, пане! Гэта ж мая хутра!

— Ну во, бачыце, гаспадзіны суддзі: ён ужо кажа, што і конь яго!

Суддзі тыя думалі, думалі ды і кажуць пану:

— Не, брат, ідаць, што ты маніш, што гэта ўсё тваё: і хутра, і боты, і конь, і грошы!

І нічога не прысудзілі Несцерку. Сеў той Несцерка на каня і паехаў у двор. Засталіся яму і конь, і боты, і грошы. І цяпер ён жыве з тых грошай.

Лексический комментарий к тексту

Нéсцерка — ласк. от *Несцер,* герой белорусских народных сказок

Юр'я — разг. от *Юрый,* под влиянием названия праздника *Юр'е*

у застáву — в заклад

страмянá — диалектная форма, лит. *стрэ́мя* (ср. р.)

дажыдáе — диалектная форма, лит. *чакáе*

нáдабнасці — диалектная форма, лит. *патрэ́бы*

атабрáў — диалектная форма, лит. *адабрáў*

але-ткі — разг. от *але такі*

напрáсна — диалектная форма, лит. *дармá*

спрáшвае — диалектная форма, лит. *пытáе*

дзéлаеш — диалектная форма, лит. *рóбіш*

з гарý-грóшы — деньги сразу

ксціцца — диалектная форма, лит. *хрысціцца*

А нех ці, пáне, д'яблы ўзялі! — *А няхáй цябé, пáне, д'яблы вóзьмуць!* — Пусть тебя, пан, черти возьмут

хýтра — диал., лит. *фýтра* — шуба

во — лит. *вось* — вот

манíць — врать, лгать

Упражнения

1. Выпишите сначала предложения, в которых именная часть составного сказуемого стоит в именительном, затем в творительном падеже.

З цягам часу Ліда стане яшчэ больш прыгожым горадам. *(«Звязда»)* Здарэнне было больш недарэчна-

смешнае, чым крыўднае. *(А. Куляшоў)* Шурпатая кара дрэва была цёплай, пахучай. *(М. Лынькоў)* Саша і Пеця тады яшчэ малыя былі. *(І. Шамякін)* На гнілую багну з ліхарадкаю пусцім стрэлы светлыя канаў, каб зямля была сухой і гладкаю, каб палескі змрок навек сканаў. *(П. Панчанка)* Тады нейкімі светлымі рабіліся яе цёмныя вочы, і ўся яна здавалася лёгкай і простай. *(М. Паслядовіч)* Здавалася, што і хата стала зусім іншая. *(І. Шамякін)* Яна была і спраўная і працавітая, ды гэта ўсё — не тое. *(Я. Брыль)* Каўрыжка яго прозвішча. *(І. Мележ)* Усмешка рабіла яго маладзейшым нават за свае васемнаццаць год. *(І. Мележ)* Быстроў выступіў апошні. *(І. Мележ)* Поле было бяскрайнім і бязлюдным. *(Т. Хадкевіч)* Ты жадала, каб я быў харобрым, статным і вучоным. *(П. Панчанка)*

2. Спишите, подчеркивая сказуемое. Определите, как их можно было бы перевести на русский язык, чтобы сохранить смысл предложения.

Адтуль пачалася была страляніна. Неба дажджлівою хмарай абложана. На жывой касці мяса мусіць нарасці. Ён быў купец. Яго няма дома. Ходзіць ні гола, ні адзета. Чужая хата горшая за ката. Сталіца Англіі называецца Лондан. Камандзір прызначыў яго за старшыну. Ён быў за машыніста. Яму было шкада дзядзьку, які ратаваў яго жыццё і быў за бацьку. Мне хацелася б у механікі падацца, ці ў крайнім выпадку за дарожнага майстра. Сам начальнік меўся прыехаць. Сталы былі непрыбраныя. Усе крэслы былі заняты. Чалавек прыкуты цяжкай хваробай да пасцелі. Яна сядзела скамянелая ад жудасці. Ты стаў проста двурушнік. Хлопцы завуцца Уладзік і Шура. Ён быў прыкінуўся хворым. Стрэлачнік памкнуўся быў даць лататы. Сам начальнік меўся прыехаць. Ніякіх асаблівых навін не чуваць было. Былі відаць толькі пні. Мы цябе за разумнага ўважаем. Каўнер у цябе завялікі. Гарнітур быў нішто, але няспрытна ж вельмі сядзеў.

3. Сравните употребление кратких и полных форм прилагательных и причастий в качестве именной части составного сказуемого. В каких случаях отдается предпочтение кратким формам?

Хай думае лепш, што здароў я і жыў... *(М. Танк)* І вы будзьце ўсе здаровы, будзь і ты здароў, дзядок. *(Я. Колас)* Яна быццам знарок пазбягала яго, станавілася далёкай і недаступнай. *(Т. Хадкевіч)* Дождж ішоў спорны і цёплы. *(І. Шамякін)* Лагчына пасярэдзіне была

забалочаная. *(І. Мележ)* Голас аднаго з хлопцаў быў вясёлы і жартаўлівы. *(К. Чорны)* Сто гадоў рос ты, дуб, быў нам дораг ї люб. *(П. Броўка)* Руды наш стаў дабёр і гладак, аж чуць цягае ўжо азадак. *(К. Крапіва)* Ад гора горбіцца бедная маці, і белы свет ёй зрабіўся не міл. *(П. Панчанка)* Пытанне гэта для Саўкі было небяспечнае. *(Я. Колас)* Вада была пакрыта перламутравым блескам. *(З. Бядуля)* Здароўе Захара было падарвана гадамі вайны і голадам. *(П. Пестрак)* Сталы і столікі былі засланы чыстымі настольнікамі і настольнічкамі. *(Я. Колас)* Муры, якія і былі ў ім, асталіся пабітыя гарматамі. *(К. Чорны)* І гэтае вялікае вынаходства так і засталося незаўважаным. *(Я. Маўр)* Міхал ідзе туды, на поле, дзе Нёман, выгнуўшыся дужкай, абводзіць лес прыгожай стужкай; але цяпер марозам скован і ад людскіх вачэй захован, і толькі жолаб, нізка ўгнуты, ды лёд, ад снегу ветрам здзьмуты, яго дарогу вызначалі. *(Я. Колас)*

4. Определите значение следующих фраз путем перевода их на русский язык.

Пан Зыгмусь пачаў быў гаварыць, які ён яшчэ мужчына, але не скончыў, бо Алена не хоча яго слухаць, не спыняецца. *(Я. Колас)* Спачатку Ганарджыя быў вырашыў ад'ехаць куды-нібы на пэўны час, але потым пакінуў пра гэта думаць. *(Э. Самуйлёнак)* З разварушанага сена відаць былі ногі. *(М. Лынькоў)* У яго тоне чуваць былі кпіны моцнага чалавека над слабейшым. *(З. Бядуля)* Постаць Ігната не растаяла яшчэ ў цемры, і глухія хлюпкія крокі яго чуваць былі выразна. *(Р. Мурашка)* Вось як дзед Талаш стаўся атаманам. *(Я. Колас)* Што снілася некалі ў снах — праўдзіваю сталася явай. *(П. Глебка)* Душны закапцелы барак і штодзённае тузанне са шпаламі, бярвеннямі сталіся лячэбніцай ад усіх знямог. *(П. Пестрак)* Нікому Бушмар ні ў чым не прызнаўся, нават самой Амілі, якая пасля прыйшла была сама да яго бледная і трывожная. *(К. Чорны)* Поташ быў прыкінуўся хворым. *(М. Паслядовіч)* Потым Домна ўзяла патушыла лучыну, каб Віктар ведаў, што ў яе цяпер нікога няма. *(М. Лобан)* Абодва ўзбуджаныя, спацелыя, расхрыстаныя, з сякерамі за папружкамі і пугамі ў руках. *(К. Чорны)* А ты — я чытаў — запусцелы, зусім занядбаны цяпер. *(П. Панчанка)* Заснуў пасёлак анямелы. Даўно патушаны агні. *(Я. Колас)*

Урок 6

ПРИЧАСТИЯ И ДЕЕПРИЧАСТИЯ И ОБОРОТЫ С НИМИ

Причастия в предложении выполняют роль определения, указывая на время, а также на субъектно-объектные отношения, находящие выражение в категории залога. В белорусском языке степень употребления причастий действительного и страдательного залогов настоящего и прошедшего времени неодинакова. Следовательно, неодинаково употребительны и причастные обороты — причастия вместе с относящимися к ним словами.

В качестве определения наиболее широко употребляются причастия прошедшего времени страдательного залога, образованные с помощью суффиксов *-н-, -т-, -л-*, и соответственно обороты с этими причастиями: *І рад нагружаных фурманак паволі зрушыў, мінуў ганак. (Я. Колас) З нержавеючага сплаву гэты быў жэтон адліты. (М. Танк) Паблеклыя вочы яе глядзелі на свет з-пад нізка насунутай хусткі, здаецца, зусім абыякава. (Я. Брыль)*

Причастия страдательного залога настоящего времени, образованные с помощью суффиксов *-ем-, -ім-*, и обороты с ними встречаются главным образом в научных текстах, иногда в газетах, очень редко в художественных текстах: *Значна палепшылася якасць апрацоўваемай паверхні, павысілася стойкасць інструментаў. («Звязда») Чалавек торапка бег, падганяемы пургой, начнымі сполахамі, глухімі гукамі лесавымі, звярынымі. (М. Лынькоў)* В связи с этим многие считают их вообще не свойственными белорусскому языку, появившимися под влиянием русского языка. Во всяком случае рекомендуется избегать их употребления. Обычным способом замены таких оборотов является превращение их в определительные придаточные предложения, опускание и подыскивание каких-то синонимических форм. Так, в примере из «Звязды» можно сказать: *Значна палепшылася якасць паверхні, якая апрацоўваецца, павысілася стойкасць інструментаў* или *Значна палепшылася якасць паверхні пры апрацоўцы, павысілася стойкасць інструментаў.* В случаях, аналогичных другому примеру, иногда употребляются причастия прошедшего времени. Например, у А. Кулешова: *Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны*; у Я. Купалы: *Доляй мучаны паганай, след слязой пачнеш крывіць...*

Причастия действительного залога настоящего времени с суффиксами *-уч- (-юч-), -ач- (-яч-)*, а также прошедшего времени с суффиксами *-ш-, -ўш-* в форме именительного и винительного падежей являются омонимами с деепричастиями. Так, в предложениях *Студэнт, выканаўшы кантрольнае заданне датэрміново, можа адпачыць. Чалавек, плывучы праз рэчку, не спыняўся* формы *выканаўшы, плывучы* можно понимать как причастие и как деепричастие. В связи с этим причастия чаще всего заменяются определительными придаточными предложениями: *Чалавек, прыехаўшы з вёскі, спыніўся ў знаёмых.— Чалавек, які прыехаў з вёскі, спыніўся ў знаёмых. Рабочы, працуючы на гэтым станку, некалькі разоў вымушаны адпачываць.— Рабочы, які працуе на гэтым станку, некалькі разоў вымушаны адпачываць.* Когда же подобные обороты разумеются как деепричастные, они заменяются обычно придаточными предложениями времени: *Калі чалавек прыехаў з вёскі, ён спыніўся ў знаёмых. Калі рабочы працуе на гэтым станку, ён некалькі разоў вымушаны адпачываць.*

В других падежах омонимия не возникает, но употребление причастий и причастных оборотов ограничивается, так как они, несомненно, отражают влияние русского языка, хотя, выражая мысль более кратко, чем придаточные предложения, они встречаются даже у классиков белорусской литературы: *Паветра напоена ціха пусцеючым мрокам. (М. Багдановіч) І халаднеючую руку Антось цалуе і рыдае. (Я. Колас) Радамі ліпы маладыя ўсталі ў зеляняючым уборы веснавым. (М. Танк) Дайце разгону, прастору дрэмлючым песням і сілам. (Я. Купала) Па доўгаму калідору хадзілі ўзад і ўперад толькі што прыехаўшыя сяляне. (К. Чорны) Асудзіць патрабуюць яны чалавека без веры, уцякаўшага ад вайны, да вышэйшае меры... (А. Куляшоў)*

Не соответствующими литературной норме являются иногда встречающиеся причастия с суффиксами *-ушч-* и *-ашч-* или оканчивающиеся на *-ся: Знайшоўся падхадзяшчы чалавек і ў нашых прыяцеляў. Узбіўся на шчыльна пераплёўшыйся лазняк.*

Причастия и причастные обороты могут заменяться не только придаточным предложением, но и другими синонимическими средствами в зависимости от контекста:

абгарэўшыя дрэвы — абгарэлыя дрэвы
згніўшыя дошкі — спарахнелыя дошкі
спацеўшыя рукі — спацелыя рукі
замерзшая рака — замерзлая рака

дзеясловы, абазначаючыя рух — дзеясловы са значэннем руху
схаваліся за растучымі кустамі — схаваліся за кустамі
кіруючыя кадры — кадры кіраўнікоў, кіраўнікі
паясняючыя словы — паясняльныя словы
пагасшыя вочы — пагаслыя вочы
зацвярдзеўшыя гукі — зацвярдзелыя гукі
змяняемыя часціны мовы — змяняльныя часціны мовы
вышэйстаячая арганізацыя — вышэйшая арганізацыя
ніжэйстаячая арганізацыя — ніжэйшая арганізацыя
зачарсцвеўшы хлеб — зачарсцвелы хлеб, чэрствы хлеб и т. д.

Все сказанное не относится к некоторым причастиям тогда, когда они фактически утрачивают приметы глагола в контексте или полностью превратились в прилагательные: *ляжачы, гарачы, гаючы, калючы, скрыпучы, будучы, бліскучы, знаёмы, цярпімы, вядомы, рухомы, ажыццявімы* и т. д. Выражения типа *ляжачы конь, бягучы чалавек, стаячы гадзіннік* редко встречаются в литературе, ибо тут причастия сохраняют глагольные приметы, но совершенно нормальными следует считать выражения *ляжачы камень, бягучы год, стаячая вада.*

Деепричастия, оканчивающиеся на *-учы, -ючы* настоящего времени и оканчивающиеся на *-ўшы, -шы* прошедшего времени, а также обороты с ними очень широко представлены в литературной речи: *Потым, як Мар'я, узяўшы пісьмы і газеты ў вёску, пайшла, ён, пакінуўшы кантору, хадзіў па вуліцы і, гледзячы, як, весела гаворачы, з'язджаліся людзі на кірмаш, стараўся дадумацца, ці ёсць на свеце прычыны для пастаяннай чалавечай радасці. (К. Чорны)*

Деепричастия в белорусском языке, в отличие от русского языка, образуются практически от всех глаголов, в том числе и односложных:

бегчы — бегучы
ехаць — едучы
рэзаць — рэжучы
хацець — хочучы
жаць — жнучы
ліць — льючы
даваць — даючы
есці — еўшы
мець — маючы, меўшы и т. д.

Деепричастные обороты передают действие, поэтому они должны относиться к подлежащему в двусоставном предложении: *Яе халодныя сталёвыя струмені ціха ўсхліпваюць, б'ючыся аб гладкі каменны бераг. (Я. Колас) — струмені ўсхліпваюць і б'юцца. Вёска грэлася на сонцы,*

гледзячыся ў рэчку з узгорка, і кожны дзень усход сонца сустракала яна шумам працы. (К. Чорны) — *вёска грэлася і глядзелася.* При нарушении этого условия получается неправильно построенное предложение: *І часам, ідучы дадому са станцыі, утаміўшыся выгрузкай дроў з вагонаў, у яго з'яўлялася жаданне, як бы хутчэй зноў вярнуцца туды.*— *жаданне з'яўлялася*, но оно не *ішло дадому*, не *ўтамілася*. Вторую часть предложения следовало бы оформить так: *ён адчуў, што з'яўляецца жаданне...* Тогда: *ён ішоў, утаміўся і адчуў.*

Деепричастные обороты употребляются в безличных и обобщенно-личных предложениях: *Добра ў садзе хадзіць, сустракаючы сонечны ранак. (П. Панчанка) Ідучы паляваць на зайцаў, рыхтуйся да сустрэчы з мядзведзем.*

Деепричастия, которые стали предлогами, сохранили глагольное управление:

дзякуючы каму, чаму?
нягледзячы на каго, што?
выходзячы з чаго?
уключаючы, выключаючы каго, што?

СЛОВА И ВЫРАЖЕНИЯ

Ко́лькі ў Мі́нску вакза́лаў? — Сколько в Минске вокзалов?

Вы пыта́еце пра чыгу́начныя ці аўто́бусныя? — Вы спрашиваете о железнодорожных или автобусных?

Як хутчэ́й тра́піць у аэрапо́рт? — Как быстрее попасть в аэропорт?

Ві́ды гарадско́га тра́нспарту: трамва́й, тралéйбус, аўто́бус, таксі́, метро́.— Виды городского транспорта: трамвай, троллейбус, автобус, такси, метро.

Прыпы́нак — остановка.

На які́м прыпы́нку выхо́дзіць? — На какой остановке выходить?

Вы выхо́дзіце? Ці выхо́дзіце вы? — Вы выходите? Выходите ли вы?

Падкажы́це, калі́ ла́ска, як прайсці́ на пло́шчу Незалéжнасці (Перамо́гі, Свабо́ды, Ванéева)? — Подскажите, пожалуйста, как пройти на площадь Независимости (Победы, Свободы, Ванеева)?

Раскла́д ру́ху аўто́бусаў — расписание движения автобусов.

Давéдка (бюро́ давéдак) — справочная, справка (справочное бюро).

Мінгардаве́дка — Мингорсправка.

Калі́ ідýць пайднёвыя паязды́ на Санкт-Пецярбýрг праз Оршу? — Когда идут южные поезда на Санкт-Петербург через Оршу?

У ко́лькі мы паві́нны быць на вакза́ле? — Во сколько мы должны быть на вокзале?

Калі́ трэ́ба быць у аэрапо́рце? — Когда надо быть в аэропорту?

Гэ́ты рэйс прамы́ ці з пераса́дкай? — Этот рейс прямой или с пересадкой?

Гэ́ты рэйс мне не падыхо́дзіць.— Этот рейс меня не устраивает.

Ка́мера захо́ўвання ручно́й пакла́жы — камера хранения ручной клади.

Пачака́льная (за́ла чака́ння) — зал ожидания.

За́ла чака́ння на другі́м паве́рсе.— Зал ожидания на втором этаже.

Папярэ́дні про́даж біле́таў — предварительная продажа билетов.

Зваро́тны біле́т — обратный билет.

Праязны́ біле́т — проездной билет.

Біле́т туды́ і наза́д — билет туда и обратно.

Сезо́нны праязны́ білет (імянны́) — сезонный проездной билет (именной).

Ваго́н для некурцо́ў — вагон для некурящих.

Агу́льны, плацка́ртны, купэ́йны вагон — общий, плацкартный, купейный вагон.

Ху́ткі (ско́ры) по́езд, цягні́к — скорый поезд.

Ху́ткасны (скарасны́) аўто́бус — скоростной автобус.

Мя́ккі, цвёрды аўто́бус — мягкий, жесткий автобус.

Вадзі́цель (шафёр), як мне знайсці́ сваё ме́сца? — Водитель, как мне найти свое место?

Гэ́тыя ме́сцы во́льныя? — Эти места свободны?

Ці мо́жна прыпыні́ць аўто́бус на хвілі́нку? — Можно ли остановить автобус на минутку?

Ко́лькі гадзі́н мы будзе́м у даро́зе? — Сколько часов мы будем в дороге?

Крышку пасу́ньцеся, калі́ ла́ска.— Немножко подвиньтесь, пожалуйста.

Транзі́тны (праходны́) аўто́бус — проходной автобус.

Спадаро́жны аўто́бус — попутный автобус.

По́езд (цягні́к) ідзе́ да Масквы́.— Поезд следует до Москвы.

Па шляху́ ру́ху по́езда (цягніка́) — по пути следования поезда.

По́езд (цягні́к) далёкага накірава́ння (накіру́нку) — поезд дальнего следования.

Вам трэ́ба звярну́цца ў бюро́ даве́дак.— Вам следует обратиться в справочное бюро.

Бюро́ знахо́дак — бюро находок.

Пако́й ма́ці і дзіця́ці — комната матери и ребенка.

Пако́й адпачы́нку — комната отдыха.

Стая́нка 10 міну́т — стоянка 10 минут.

По́езд (цягні́к) адыхо́дзіць ад трэ́цяй платфо́рмы, шо́стага пуці́.— Поезд отправляется от третьей платформы, шестого пути.

ТЕКСТ

У родным доме і сцены памагаюць. Неўзабаве пры рынку, у доме «найстаршага бурмістра слаўнага і вялікага горада Віленскага», запрацавала Скарынава друкарня. І вось Вільня трымае ў руках першыя друкаваныя кнігі ў гэтых землях — «Малую падарожную кніжыцу» і «Апостал».

Давайма і мы зірнём на гэтыя першыя ў нашай бацькаўшчыне выданні...

Надрукаваныя ў дзве фарбы, з прыгожымі літарамі-ініцыяламі і віньеткамі з раслінным арнаментам, яны, здаецца, знарок створаны на радасць воку. Як прыгожа глядзіцца старонка! Вось багатая шырокая застаўка адкрывае раздзел, пад ёю назва, пад назваю зноў застаўка, але больш вузкая...

Міжволі згадваюцца словы выдатнага рускага гісторыка мастацтва і крытыка У. Стасава: «Тая прыгажосць малюнка, тое майстэрства гравюры, якія на кароткі час прамільгнулі ў выданнях... скарынінскіх, ніколі ўжо больш не паўтарыліся ні ў адным выданні царкоўнаславянскага друку на працягу ўсёй другой паловы XVI, усяго XVII і першай паловы XVIII стагоддзяў»...

Добра прадуманы фармат выданняў. Ужо сваім выглядам «Апостал» кажа, што ён разлічаны не для царкоўнай службы, а для хатняга чытання. Памер невялікі — самы раз, каб, узяўшы ў рукі кнігу, прысесці з ёю ў нядзельку за сталом. Не той шыкоўна вялізны, з якім «служка божы» выходзіў чытаць парафіянам у царкве. І зусім кішэнны фармат у «Малой падарожнай кніжыцы», разлічанай на купцоў і рамеснікаў, якім не раз даводзілася выпраўляцца ў далёкую дарогу.

Францыск Скарына, як у Празе, так цяпер у Вільні, выдае свае кнігі з асветніцкімі мэтамі для небагатых людзей, як ён сам піша, «людзям паспалітым на добрае навучанне».

З гэтага боку асабліва цікавая апошняя частка «Малой падарожнай кніжыцы», дзе змешчаны розныя каляндарныя, астранамічныя і нават медыцынскія звесткі — усё тое, што найнеабходней было чалавеку ў дарозе.

І для нас з вамі цікава прачытаць, скажам, такія радкі: «месець септеврий зовемы вресень», «февраль... люты», «июнь... чирвець», «июль... липець». Нягледзячы на старое пісьмо, здаецца, бруіць у іх наша сённяшняя беларуская мова.

Скарына тут падае такія каляндарныя звесткі, якіх не было раней у падобных, нават самых лепшых заходнееўрапейскіх выданнях. Яго каляндар добра адрозніваецца ад царкоўных, якія зводзіліся толькі да пераліку рэлігійных свят ды дзён «святых». Дбаючы пра асвету, Скарына паведамляе чытачу, колькі які месяц мае дзён, якая даўжыня дня і ночы ў розныя месяцы (напрыклад, пра 17 ліпеня: «День имать годин 17, а нощ 8»), а таксама даты веснавога і восеньскага раўнадзенства, летняга і зімовага сонцастаяння.

Гэтая каляндарная частка «Малой падарожнай кніжыцы» паказвае нам Скарыну яшчэ і як выдатнага матэматыка і астранома. Скарына зрабіў падлікі, якіх ніхто да яго не рабіў на ўсходнеславянскіх землях і якіх ніхто не падасць і пасля Скарыны аж да 18 стагоддзя. Ён прадказаў шэсць месячных і адно сонечнае зацьменні, якія змаглі ўбачыць жыхары Беларусі і Літвы ў 1523—1530 гадах. І ўсё гэта дакладна збылося...

(Отрывки из книги: *А. Клышка. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніжка*)

Лексический комментарий к тексту

неўзабáве — вскоре, в скором времени
друкавáны — печатный
выдáнні — издания
літара — буква
знарóк — нарочно, намеренно, умышленно
старóнка — страница
разлíчаны — рассчитанный
хáтняе чытáнне — домашнее чтение
памéр — размер
нядзéлька — уменьш., воскресенье
шыкóўна вялізны — шикарно огромный, большущий

кішэ́нны — карманный

парафія́не — верующие одной парафии — территории, относящейся к одному костелу

асве́тніцкі — просветительский

паспалі́ты — польск. уст., простонародный

зве́сткі — сведения

ціка́ва — интересно

бруі́ць — струиться

дбаць — заботиться

падлі́к — подсчет

дакла́дна — точно

Упражнения

1. Спишите, подчеркивая причастия одной чертой, деепричастия — двумя.

Азірнуліся на пакінутыя ззаду кусты ды пайшлі к лясам. *(К. Чорны)* Здаецца, аж сюды, да самага лесу, далятаў гул вялізнага пажару, узнікшага за якую хвіліну. *(М. Лынькоў)* Пасядзеўшы крыху такім чынам, ён падымаўся з месца і ішоў у свой пакой на супачынак. *(Я. Колас)* Адпачыўшы крыху, Рыгор падняўся з крэсла і пачаў тупаць па пакоі. *(Ц. Гартны)* Нават неба на захадзе, святлеючы доўгі час пасля заходу сонца, стала тускнець і агортвацца ў лёгкую летнюю цемру. *(Я. Колас)* Бліснуў лысінай пень, елка вырвала з ценяў свой цень, на паляне ляснай кладучы яго побач з сабой. *(А. Куляшоў)* На парце, сціснуўшы галаву далонямі, сядзела з акамянелым тварам Рая, ды ў праходзе паміж партамі стаяла з абыякавым выглядам другая вучаніца — кульгавая, хваравітая Ніна Кулікава. *(І. Шамякін)* Паднятыя і ачышчаныя баравікі грыбнік клаў на чыстае месца ў кучу. *(Я. Колас)* Стомленыя за дзень людзі хутка паснулі. *(М. Лынькоў)* І колькі ў іх прывабнага, заспакойваючага душу хараства! *(Я. Колас)* Пачуўся званок, абвяшчаючы падыход поезда. *(Ц. Гартны)* Атрад, прыбыўшы сюды на світанні, размясціўся ўздоўж чыгункі на сушэйшым месцы. *(П. Пестрак)* Хачу высветліць фактам усе маючыяся быць непаразуменні. *(К. Чорны)*

2. Произведите замену причастий действительного залога более приемлемыми для белорусского языка выражениями.

Апусцеўшыя палі выглядалі сіратліва. Паружавеўшыя ад марозу шчокі пахарашэлі. Сон зусім адышоў ад разамлеўшага хлопца. Чуваць крыкі птушак, адлятаючых у вырай. З саду даносіўся ап’яняючы пах. Рэчывы, сты-

мулюючыя рост раслін, можна набыць у аддзеле бытавой хіміі. Калі ўзяць атрымліваемыя прыбаўкі ўраджаю ў разліку на цэнтнер высяваемага насення, то можна ацаніць эфектыўнасць прымяняемага ўгнаення. Заходзячае сонца чырваніла неба. Пераспеўшае збожжа пачынала асыпацца. Голас, співаўшы песню, рэзка абарваўся. Ад вады патыхала гаркатой гніючага алешніку. Хістаючымся крокам ён ішоў па дарозе. У надышоўшым змроку цвецень выглядала снегавой замеццю. Для гэтай пасады ён падхадзяшчы чалавек.

3. Спишите, вместо глаголов в скобках употребите образованные от них причастия или деепричастия.

(Прыслухоўвацца) да ціхага плёскату нарачанскіх хваляў, Якуб Колас расказваў нам шматлікія гісторыі са свайго багатага жыцця. *(М. Лынькоў)* Далячынь віднелася па-асенняму задуменная, маркотная, са сваімі (апусцець) палямі, з (пагалець) там і тут дрэвамі. *(І. Мележ)* Сцёпка доўга стаяў, (любавацца) горадам, і нейкае новае адчуванне калыхала яго, прыцягвала да гэтага горада і ў той жа час палохала і непакоіла. *(Я. Колас)* (Угледзець) людзей, якія беглі к яму, ён махнуў нагамі, скінуў з іх жалезныя лапы, (дзякаваць) якім узлез на слуп, і, (ссунуцца) па гладкім дзераве на зямлю, кінуўся бегчы. *(К. Чорны)* І ветры прынеслі ёй вестку ліхую, што сын яе ў бітве загінуў, жыццё, (даравацць) роднай матуляй, (аддаць) за маці-Краіну. *(Ю. Таўлай)* І знямела, як арліны клёкат, слова (набаліць) ў грудзях. *(А. Пысін)* Ёсць хараство і ў гэтых зімах і ў мёртва-белых тых кілімах, што віснуць-зззяюць хрусталямі над (занямець) лясамі. *(Я. Колас)* Жытняя рунь нагадвала цёмна-зялёны аксаміт, (разаслаць) на вялізным абшары поля. *(Т. Хадкевіч)*

4. Переведите с русского языка на белорусский.

Горы, поросшие деревьями, уродливо изогнутыми нордостом, резкими взмахами подняли свои вершины в синюю пустыню над ними, суровые контуры их округлились, одетые теплой и ласковой мглой южной ночи...

Хорошо одному на краю снежного поля, слушая, как в хрустальной тишине морозного дня щебечут птицы, а где-то далеко поет, улетая, колокольчик проезжей тройки, грустный жаворонок русской зимы...

Нас выпороли и наняли нам провожатого, бывшего пожарного, старичка со сломанной рукою, он должен был

следить, чтобы Саша не сбивался в сторону по пути к науке. Но это не помогло: на другой же день брат, дойдя до оврага, вдруг наклонился, снял с ноги валенок и метнул его прочь от себя, снял другой и бросил в ином направлении, а сам, в одних чулках, пустился бежать по площади. Старичок, охая, потрусил собирать сапоги, а затем, испуганный, повел меня домой.

(М. Горький)

Урок 7

СОЮЗЫ В ПРЕДЛОЖЕНИИ

Важными строительными элементами предложения являются союзы — слова (обычно краткие), не имеющие лексического значения и употребляющиеся для связи синтаксических единиц: членов предложения, частей сложного предложения, самостоятельных предложений. Они указывают обычно на смысловые и грамматические отношения между синтаксическими единицами.

По своему происхождению союзы бывают производные и непроизводные. Непроизводные союзы не соотносятся ни с какими другими словами в языке, имеющими лексическое значение, а потому и воспринимаются носителями языка как извечные: *і, а, але, ды, каб, ні, ці* и т. д. Производные союзы возникли в результате перехода слов из знаменательных частей речи; эти слова стали указывать лишь на отношения между синтаксическими компонентами предложения. Так, союзы *што, таму* образовались из местоимения; *калі, дзе, як* — из наречий; *нібы, быццам* — из частиц; *хоць, хай* — из глаголов и т. д.

Все приведенные выше союзы являются простыми. Однако многочисленны и составные: *таму што, для таго каб, нягледзячы на тое што, пасля таго як, у той час як* и т. д. Благодаря составным союзам достигается однозначность синтаксического значения, что важно, в частности, для делового и научного стилей (ср., например, клише делового стиля: *у сувязі з тым, што; для таго, каб; за кошт таго, што; зыходзячы з таго, што; нягледзячы на тое што* и т. д.).

Помимо союзов, в выражении связи между предложениями могут участвовать союзные слова — местоименные слова вопросительного типа, в которых совмещены свойства самостоятельной и служебной части речи. Это местоимения-существительные *хто, што,* местоименные прилага-

тельные *які, каторы, чый,* местоименные наречия *дзе, куды, адкуль, як, чаму,* местоименное числительное *колькі.*

Существенное значение имеет функциональное разделение союзов на сочинительные и подчинительные. Сочинительные союзы оформляют отношения как между членами предложения, так и между простыми предложениями в составе сложного, если эти предложения более или менее равноправны. Подчинительные союзы и союзные слова соединяют части сложного предложения, которые находятся в подчинительной связи между собой. В этом смысле их функция напоминает функцию предлогов, обозначающих подчинительную связь членов предложения. Для связи членов предложения они употребляются редко. Например, в предложениях типа *Нявопытны, бо яшчэ вельмі малады, майстар разгублена глядзеў на нас. Ён рабіў усё старанна, хоць і не хутка* подчинительные союзы *бо, хоць* объединяют однородные члены предложения. Кроме того, в простом предложении подчинительными союзами присоединяются сравнительные обороты.

Сочинительные союзы разделяются на:

1) соединительные: *і, ды, дый, ні...ні, як...так і, таксама;*

2) противительные: *а, але, ды* (в том же значении, что и *але*), *аднак жа, затое, а то, не толькі...але;*

3) распределительные: *або...або, альбо...альбо, ці, ці...ці, не то...не то, ці то...ці то;*

4) присоединительные: *ды і (дый), нават, прытым;* в функции присоединительных могут использоваться и другие союзы, если они связывают синтаксические единицы с дополнительной информацией, не содержащейся в первой единице.

У некоторых авторов наблюдается тенденция в любых контекстах заменять союз *і* союзом *ды* или *дый.* Однако такая замена не всегда оправдана, так как их употребление связано с различными контекстными значениями. Союз *і* имеет значение перечисления равноправных членов предложения или простых предложений в составе сложного: *Як пухам, сняжком пасыпала і хвою, і елку, і клён. (Я. Купала) Гугухне голас угары, і шыба ў вокнах забразгоча, і гоман пойдзе па бары. (Я. Колас)* Саюз *ды* имеет значение категоричности, завершенности перечисления, часто придает речи неофициальный, бытовой характер: *Ва ўсіх шчасце на твары вясёлкай гуляе ды ахвоціць да працы святой. (Я. Купала) Жылі сабе дзед ды баба. Вырас засей небывалы, ды прыгожы, ды прыўдалы,— племя арлянятаў. (Я. Колас)* Этот союз употребляется также при

повторении слова для усиления: *Усё балоты ды балоты.* *(Я. Колас) Усё я ды я.* Часто и в соединительном значении союз *ды* сохраняет оттенок противопоставления, в частности в примере *Вырас засеў небывалы, ды прыгожы, ды прыўдалы...*— небывалый, но замечательный. Это значение противопоставления для него является основным, в котором он чаще всего и употребляется: *Ешце, ды ў вочы не лезьце!* Оно может усиливаться различными частицами: *Вясёлы ходзіць, спявае, ды толькі ўсё гэта не ў час. (К. Чорны) Падступіцца да гарэўшых цыстэрнаў не было ніякай магчымасці, ды гэта было і небяспечна. (М. Лынькоў) Слых мой толькі праз момант ловіць музыку ціхага шуму лісця, ды і то мне спачатку здаецца, што гэта ўсё яшчэ шуміць у галаве. (Я. Брыль)*

Союз *дый* образовался из сочетания *ды і* и также характерен для разговорного стиля. В качестве соединительного союза близок по значению союзам *і* и *ды: Палазіў Януш ля воза, выцягнуў рыдлёўку, узяў сякеру дый падаўся* [*у лес*]. *(Я. Скрыган)* Этот союз присоединяет члены предложения и предложения, уточняющие, завершающие или обобщающие ранее высказанную мысль: *Дома практыкавацца... няма калі дый нязручна. (Я. Колас) Развітаўшыся з Захарам, Андрэй палявымі дарогамі пайшоў, кіруючыся да Апанаса Хмеля. Дарога была няблізкая, але дня яшчэ хопіць, дый пагода спрыяе. (П. Пестрак)*

Союз *а* обычно имеет противительное значение, соединяя противоположные по смыслу члены предложения или предложения, сопоставляя их: *Смерць героя не прыгнятае жывых, а кліча да новых подзвігаў. (К. Крапіва) Чалавек мой яшчэ ў партызанах загінуў, а Мішка ажно да Берліна дайшоў. (Я. Брыль) Факт ёсць факт, а дакумент застаецца дакументам. (Я. Колас)* Однако он может иметь и присоединительное значение: *Гарыць агонь, а на агні гатуецца вячэра. (М. Танк)*

Подчинительные союзы по своему значению можно разделить на следующие группы: временные, условные, причинные, целевые, уступительные, сравнительные, пояснительные и результативные. Каждая из этих групп связывает части сложноподчиненных предложений в зависимости от отношений, существующих между ними. Перечислим основные подчинительные союзы по группам:

временные: *калі, пакуль, як, ледзь толькі, чуць, толькі што, чуць што, абы толькі, з таго часу як, з той пары як, у той час калі, да таго часу пакуль, перш чым, пасля таго як* и т. д.;

условные: *калі (б), як (бы), каб, раз, толькі, абы;*

причинные: *бо, што, паколькі, як, таму што, з прычыны таго што, па той прычыне што, а то;*

целевые: *каб, абы, для (дзеля) таго каб, з тым каб, затым каб, замест таго каб, на тое каб, для (дзеля) чаго;*

уступительные: *хоць (хаця), няхай (хай), хіба, балазе, дарма што, нягледзячы на тое што;*

сравнительные: *як, чым (чымся), нібы, нібыта, быццам, бы, што, каб, аж (ажно), паколькі, як бы, як быццам, як і, падобна да таго як;*

пояснительные: *што, як, каб, быццам, нібы, нібыта, як бы, як быццам;*

результативные: *так што, таму, дык, ад чаго.*

СЛОВА И ВЫРАЖЕНИЯ

Бaxáнка (часцей *бухáнка*) *хлéба* — буханка хлеба.

Чвэ́ртка, палóва бухáнкі — четверть, половина буханки.

Чэ́рствы хлеб, свéжы хлеб — черствый хлеб, свежий хлеб.

Батóн — батон.

Дáйце мне, калí лáска, два рагáлікі і дзве бýлачкі, звáжце паўкілаграма абарáнкаў.— Дайце мне, пожалуйста, два рогалика и две булочки, взвесьте полкилограмма баранок.

Хлеб свéжы? — Але (так), свéжы; Не, чэ́рствы, прывéзены ўчóра.— Хлеб свежий? — Да, свежий; Нет, черствый, привезен вчера.

Пéрнік — пряник.

Крэ́ндзель — крендель.

Ватрýшка — ватрушка.

Пячэ́нне — печенье.

Кóлькі каштýюць пáчак чáю і 100 грáмаў кáвы? — Сколько стоят пачка чаю и 100 граммов кофе?

Кавя́рня — кофейня, кафе.

Цýкар — сахар.

Цукéркі — конфеты.

Ласýнкі — сладости.

Вóцат — уксус.

Дрóжджы — дрожжи.

Да вóстрых прыпрáў налéжаць: карыца, пéрац (чырвóны, чóрны, духмя́ны), гваздзíка, каля́ндра, гарчы́ца.— К острым пряностям относятся: корица, перец (красный, черный, душистый), гвоздика, кориандр, горчица.

Папрыка — паприка, красный стручковый перец.

Вяндліна — ветчина, копчености.

Вэнджаная шынка — копченый окорок.

Зважце, калі ласка, вось гэта колца каўбасы (кілбасы).— Взвесьте, пожалуйста, вот это колечко колбасы.

Рыба сыравэнджаная, гарачага вэнджання — рыба сырокопченая, горячего копчения.

Вага — весы.

Шалі — рычажные весы.

З сардзін і шпротаў можна прыгатаваць смачныя бутэрброды, асабліва калі іх аздобіць скрылікамі лімона, прыпарушыць зялянінай.— Из сардин и шпрот можно приготовить вкусные бутерброды, особенно если их украсить ломтиками лимона, присыпать зеленью.

Сметанковае масла — сливочное масло.

Сыр галандскі, мінскі, пашахонскі, дыетычны, хатні, адыгейскі, стэпавы, кастрамскі, расійскі, сялянскі.— Сыр голландский, минский, пошехонский, диетический, домашний, адыгейский, степной, костромской, российский, крестьянский.

Гарэлка — водка.

Вінна-гарэлачны магазін — винно-водочный магазин.

Шынок — шинок, трактир, кабак.

Яблыкі: антонаўка, каштэль, штрыфель, пуцінка (пуційка), малінаўка, белы наліў.— Яблоки: антоновка, каштель, штрейфлинг, путинка, малиновка, белый налив.

Адзін спелы (зялёны) яблык — одно зрелое (зеленое) яблоко.

Кісла-салодкі — кисло-сладкий.

Гатунак — сорт, категория товара по качеству, разновидность товара.

Сорт — разновидность какого-либо культурного растения, реже означает то же, что и *гатунак*.

Агароднiна (гароднiна): капуста, морква, бручка, буракі, цыбуля, рэпа, агуркі (гуркі), гарбузы, памідоры, кавуны.— Овощи: капуста, морковь, брюква, свекла, лук, репа, огурцы, тыква, помидоры, арбузы.

Садавіна: вішні, чарэшні, яблыкі, лімоны, мандарыны, апельсіны, слівы.— Фрукты: вишня, черешня, яблоки, лимоны, мандарины, апельсины, сливы.

Ягады: суніцы, маліна, чарніцы, брусніцы, ажыны, буякі, парэчкі, журавіны, трускалкі (клубніцы).— Яго-

ды: земляника, малина, черника, брусника, ежевика, голубика, смородина, клюква, клубника.

Чырвóныя, чóрныя парэ́чкі — красная, черная смородина.

Грыбы́: смаржóк, страчóк, гавару́шка, апéнька, лісі́чка, падбярóзавік (бáбка), падасі́навік (асаві́к), баравік (бéлы грыб), свіну́ха, сыраéжка, мухамóр, зялёнка, радо́ўка.— Грибы: сморчок, строчок, говорушка, опёнок, лисичка, подберезовик, подосиновик, боровик (белый гриб), свинушка, сыроежка, мухомор, зеленка, рядовка.

ТЕКСТ

Калядны вечар

(Отрывок из рассказа)

Здаецца, сам свет гатовіўся як можна лепш сустрэць калядны вечар.

Было ціха. Над белай зямлёй звіслі бясформенныя сівыя хмары. Лес перастаў хістацца, маўчаў, закрыўшыся белым інеем, усё роўна як узлажыў к святу чыстую кашулю. А стройныя елкі падымалі свае галовы высока над другімі дрэвамі, і вырысоўваліся ў небе іх вяршыні, як крыжыкі, як вежы цэркваў.

За дзень перад куццёю ляснік Тарас яшчэ досвіту ехаў гасцінцам у горад Н. Кожны год даводзілася яму ездзіць перад калядамі ў замак. Гэта язда падабалася Тарасу: яго пасылалі, як растаропнага служаку, а ў замку яго зналі ўсе паны і любілі. А самае важнае тое, што Тарас возьме з горада свайго сына, Паўлюка, які апошні год вучыўся ў семінарыі. Паўлюк — гордасць Тараса, прычына людской зайздрасці.

Тарас купіў на дарогу пачак папярос за тры капейкі, каб не так сцішна было аднаму ў полі і каб не вазіцца з курэннем на холадзе. У палукашку ў санях ляжала штук пятнаццаць зайцаў, рыба, сушаныя грыбы. Гэта — гасцінец на куццю замкавым панам ад пана ляснічага.

* * *

Тарасава пасада стаяла каля самага лесу, што цягнуўся, як падкова, роўным паўкругам. Тут жа каля хаты цякла рэчка-крыніца. Толькі самыя траскучыя маразы засцілалі яе плёнкаю лёду.

Цяпер у Тарасавай хаце кіпела работа,— гатовіліся да

свята, да каляднага вечара, таго вечара, якога так нецярпліва чакаюць дзеці і які так многа прыносіць радаснага ў шэрае жыццё простага чалавека.

Два старэйшыя Тарасавы сыны — а яны ўжо былі праўдзівыя дзецюкі — уходжваліся на двары: загатаўлялі каровам трасянку, seклі і пілавалі дровы. А іх дзядзька, Андрэй, меншы Тарасаў брат, залажыўшы сякеру за пояс, пайшоў трэсці свае кошыкі. Андрэй быў заўзяты рыбак.

А самая важная работа ішла ў хаце. Сягоння Кася раней запаліла ў печы. Белаваты дымок роўна падымаўся ўгару і расплываўся высока ў ціхім марозным паветры. Каля печы стаяў ужо заслон, накрыты чыстым настольнікам. На адным яго канцы стаяла ражка з цестам. Скавароды весела брынчалі па прыпеку, і мяккія, гарачыя аладкі кідаліся, як ігрушы, спрытнаю рукою Касі. Уся лава проці печы была застаўлена міскамі, гарнушкамі, гаршкамі з усякімі прыпасамі для вячэры.

Пачынала змяркацца.

У покуце на сене ўжо важна стаяў гаршчок з куццёю. Мужчыны ўхадзіліся і цяпер мыліся ў ночвах. Дзядзька засеў брыцца. Малыя даўно памыліся, прыбраліся і гатовы былі сесці за стол.

У хаце было ціха. Усе стараліся трымаць сябе як можна прыстойней. Нават гарбуз Міхась трымаўся, як сталы чалавек.

Невялічкая лямпачка, вісячы над сталом, надавала хаце нешта незвычайнае і новае.

Вясёлы вечар! Усе нецярпліва чакалі Тараса і Паўлюка, асабліва Паўлюка. Такі ён быў слаўны хлопец! Дый бачылі яго даўно — паўгода, дзякуй Богу, прайшло ўжо, як Паўлюка не было дома.

(Я. Колас)

Лексический комментарий к тексту

каля́ды — заимствование от латинского Calendae [календэ] — название первого дня каждого месяца у римлян

е́лка — в белорусском языке употребляется для названия дерева, новогодняя — *ёлка*

куцця́ — традиционное обрядовое блюдо на Рождество у славян и других народов, каша из перловой крупы

до́світу — диал., лит. *до́света* — до зари

гасці́нец — большак, тракт

даво́дзіцца — приходиться

падаба́цца — нравиться

за́йздрасць — зависть

сцішна — диал. жутко, страшно
палу́кашак — плетеная корзина в телеге, короб, кузов
гасці́нец — подарок
паса́да — здесь: усадьба
чака́ць — ждать, ожидать, дожидаться
шэ́ры — серый
праўдзі́вы — здесь: настоящий
дзяцю́к — молодой парень, кавалер
ко́шык — рыбацк. корзина
заўзя́ты — рьяный, ретивый, усердный, завзятый
запалі́ць у пе́чы — затопить печь
паве́тра — воздух
засло́н — диал., лит. *услон* — скамейка, скамья (переносная)
насто́льнік — скатерть
ра́жка — шайка, деревянный сосуд с рукояткой
пры́пек — шесток
спры́тны — ловкий, проворный, расторопный
про́ці — диал., лит. *супраць, насупраць*; однако широко употребляется как часть сложных слов: *проціалкаго́льны, проціле́глы, проціпастаўле́нне* и т. д.
гарну́шак — разг. горшочек
по́куць — красный угол, почетное место в углу под образами за столом
гаршчо́к — мн. *гаршкі́*
прысто́йны — приличный, пристойный
ухадзі́цца — справиться с работой
прыбра́цца — красиво одеться, нарядиться, принарядиться
трыма́ць сябе́ — держаться, вести себя
дзя́куй Бо́гу — слава Богу

Упражнения

1. Спишите, подчеркните союзы, определив, где они соединяют однородные члены, а где предложеиия.

Гаварылі, што ён меў тытул ні то графа, ні то барона. *(К. Чорны)* Так заўсёды рабілася на вуліцы, калі ці то ў пахмурны, ці то ў сонечны дзень раздавалася паблізу тая песня. *(М. Лынькоў)* Сялян другіх вёсак, якія жылі больш пры палях, яны называлі палянамі, і гэтым самым яны як бы адрознівалі іх ад сябе, жыхароў лесу. *(Я. Колас)* Я люблю ўсходы нашых палеткаў, і спавітыя ў зелень лугі, і шум бору пануры, глухі, і шаптанне крынічнае ўлетку. *(Я. Купала)* Так у госці сын прыехаў — а да маці, а не зблізку,— яе шчасце, яе ўцеха ад пялёнак, ад калыскі. *(Я. Купала)* Так ні конь, ні алень, ні арол не ляціць. *(Я. Колас)* Вы б раздзеліся, а то яшчэ гадзіну чакаць. *(К. Чорны)* Не бяда, што дожджык і гразка, затое прырода ажыве. *(Э. Самуйлёнак)* То ён знянацку пацалуе, то хустку з галавы здзярэ, то ў гуслі ён зайграе, то німфам песню запяе, то адным вокам ён міргае, як быццам ён

каго заве. *(«Тарас на Парнасе»)* Яна думае нейкія свае думкі, але якія, сказаць трудна. *(Я. Колас)* Слых мой толькі праз момант ловіць музыку ціхага шуму лісця, ды і то мне спачатку здаецца, што гэта ўсё яшчэ шуміць у галаве. *(Я. Брыль)* А цяпер хаця малачка пакаштуй, ды хлеб вось тут у мяне прызапашаны. *(М. Лынькоў)* Вясёлы ходзіць, спявае, ды толькі ўсё гэта не ў час. *(К. Чорны)*

2. Определите, какое значение имеют подчинительные союзы в следующих предложениях (временнóе, причинное и т. д.).

Калі развіднела, лейтэнант Карпаў выстраіў дывізіён. *(І. Шамякін)* А як спаць улёгся, думкі мімаволі гаманілі ў сненні хлопчыку аб школе. *(Я. Колас)* На вялікай прасторы не было відаць нікога, апрача цяляці, якое, заблытаўшы адну нагу ў вяроўку, шалёна скакала. *(К. Крапіва)* Якая шырокая спіна! Там, дзе канчаецца загар,— белая, белая шыя, як у дзіцяці. *(Я. Скрыган)* «Ой, галубочкі! Забілі некага!» — загаласілі дзяўчаты і кінуліся кулём туды, адкуль чуўся крык. *(Я. Колас)* Калі абедзве часткі няроўнасці маюць дадатны агульны множнік, то на яго можна падзяліць абедзве часткі няроўнасці. *(З падручніка)* Калі глянуць у даль вуліцы, то недалёка ад вёскі, на адселі, відзён з-за каменнай аграды, у бярозах і клёнах, касцёл. *(П. Пестрак)* Калі ў свабодзе такой пажывецца, то і за сонца плаціць давядзецца. *(Я. Купала)* І раз гэта не дазволена цыркулярна, дык і не можна. *(К. Крапіва)* Гурба стаяў недалёка ад зменшчыка, але за яго спіною, так што той яго не бачыў. *(А. Кулакоўскі)* Напішу я такую аповесць, хай сівой абрасту барадою. *(У. Хадыка)* І хоць твор гэты друкавацца не можа, аднак праз яго можна зацікавіцца аўтарам. *(К. Чорны)* Гэтая размова скора перайшла ў сварку, бо пан Зыгмусь наадрэз адмовіўся падзяліцца бульбай. *(Я. Колас)* Жыць яму з маладою цяжка таму, што і ёй з ім цяжка. *(К. Чорны)* Не для таго мы гэту гаворку пачыналі, каб вось так нічым не скончыць. *(К. Крапіва)* Ён цяпер ішоў гэтак няроўна і нязграбна нейк, што чапляўся, небарак, нагамі за кожную няроўнасць. *(К. Чорны)* Расказаў я далёка не так складна, як гэта было ўжо склалася ў маёй галаве. *(Я. Колас)* Я пажыў ужо крыху на свеце, тады як ты, можна сказаць, яшчэ не спрабаваў жыцця. *(Ц. Гартны)*

3. Спишите, подчеркивая сочинительные союзы одной чертой, а подчинительные — двумя.

Калі трапляецца ў жыцці вам рак, то, каб не каяцца

нарэшце, уведайце наперад, дзе ў ім смак, тады ўжо толькі ешце. *(К. Крапіва)* Насцеж вокны і дзверы адчынілі кватэры, запрашаюць бацькоў і дзяцей, што жылі тут раней, каб забраць іх з сабою і рухацца разам з зямлёю ад руінаў і ад успамінаў далей і далей. *(А. Куляшоў)* Тут Ігналя схваціўся, як бы ад цяжкага сну, азірнуўся,— ажно вакол яго стаіць грамада людзей. *(З. Бядуля)* І зоры свецяць, а хіба ж іх паляць? *(М. Лынькоў)* Прыдзе новы — а мудры — гісторык. *(Я. Купала)* Што ні кажы, а жыццё, ужо само па сабе, ёсць радасць. *(Я. Колас)* Хоць зорачка — ды не вячэрняя, і каханачка — ды няверная. *(М. Багдановіч)* Хоць не труслівы я дзяціна, але затросся як асіна. *(«Тарас на Парнасе»)* Вялікая частка зямлі была падзелена на роўныя квадраты, падобна да таго як было зроблена паўвека назад. *(З падручніка)* Няхай заслала неба хмаркай, а сонца вернецца да нас. *(Я. Колас)* Які дзівосны сад квітнеў бы тут, каб рука чалавека адвяла воды горных рэк, што затапляюць нізіну. *(Э. Самуйлёнак)* Той, хто не чуў народнай гаворкі з усім багаццем яе лексікі і фразеалогіі, хто абыякава ставіцца да гэтай найбагацейшай крыніцы, той не зможа стварыць яркіх, паўнакроўных твораў. *(К. Крапіва)*

Урок 8

О НЕКОТОРЫХ ТИПАХ ПРОСТОГО ПРЕДЛОЖЕНИЯ

Среди различных по структуре простых предложений есть несколько разновидностей, которые весьма специфичны. В частности такими являются безличные предложения, образуемые с помощью глаголов *чуваць, відаць* и некоторых других, типа: *Чуваць здалёк дажынкавую песню. (Я. Купала) Пілу цяжэй чуць будзе. (К. Чорны) З высокага ўзбярэжжа было добра відаць усю пространь балота. (Э. Самуйлёнак)*

В предложениях подобного типа объект действия обычно выражается винительным падежом имени, а при инфинитиве может быть глагольная связка, которая указывает на будущее или прошедшее время. Обычным элементом таких предложений является также поясняющее глагол обстоятельство, выраженное наречием, хотя вполне нормальны и конструкции без обстоятельства, например: *Чуваць ігру на скрыпцы. (Я. Купала) Відаць усю сцяну. Блізка відаць, ды далёка дыбаць.* В случае наличия

отрицания дополнение может выражаться родительным падежом: *Не, нічога не выходзіць — не відаць Аленкі. (Я. Колас) Начуйце здаровы: вам жа ж свае хаты на адну ноч не будаваць.*

Семантически тождественными с такими предложениями являются безличные предложения со словами *бачна, відно, чутно: Пайсці б пашукаць свайго сына па свету — не бачна і следу. (П. Панчанка) Яшчэ некалькі хвілін не відно было коней. (А. Кулакоўскі) Не чутно, як звычайна, аукання ў лесе, толькі дождж шуміць і шуміць. (М. Лупсякоў)* Имеются также безличные предложения, у которых сказуемое выражено качественным прилагательным среднего рода с глагольными связками *быць* или *стаць: У мяне свайго дабра багата. Стала яму лягчэй. Страшна было салдатам.*

Близки к этим конструкциям предложения, у которых главный член предложения выражен инфинитивом. Дополнение в этом случае может быть в творительном или дательном падеже: *Навошта козамі сена травіць? Зары чырванець, а табе здаравець!*

В белорусском языке представлены безличные предложения, у которых глагол-сказуемое стоит в 3-м лице единственного числа, а дополнение в дательном падеже: *Мёртвым не баліць. Мне муляе. Нам не спіцца.* Близки к безличным инфинитивные предложения, у которых главный член выражен независимым инфинитивом, часто с частицей *бы (б): Пахадзіць бы ў іх гушчары так праз месяц, калі яны ўзнімуцца казачным лесам, падыхаць бы тады іх водарам. (Я. Брыль) Цябе не пазнаць, Антонавіч. (І. Шамякін)* В таких предложениях инфинитив может дополняться указанием на деятеля, название которого стоит в дательном падеже: *Быць заўсёды і ўсюды табе неразлучнай са мной! (П. Панчанка)*

Сочетание инфинитива и дательного падежа обычно обозначает действие неизбежное или необходимое: *Ды толькі дням не дагараць спакойна ў сонечным загары, як некалі. (М. Танк)* Неизбежность действия особенно подчеркивается отрицанием *не: Старадаўняй Літоўскай Пагоні не разбіць, не спыніць, не стрымаць. (М. Багдановіч)* В форме инфинитивных предложений нередко отдаются приказания: *Ехаць заўтра. Ледзь свет. (А. Куляшоў) Каленіку ісці ўправа ад рэчкі. (П. Галавач)*

Если в таких предложениях употребляется частица *бы (б)*, то они обычно выражают желание выполнить какое-либо действие: *Спусціць бы і нам сваё балота.*

(Я. Колас) Вось каб яго знайсці. (І. Мележ) На сяўбу прыйсці б дамоў нам. (М. Лужанін)

Необходимо обратить внимание на правильное употребление конструкций типа *у мяне ёсць — я маю.* На первый взгляд они идентичны по смыслу, ибо обозначают принадлежность кого- или чего-нибудь. Однако такая синонимичность этих оборотов наблюдается не всегда.

Выражения *у мяне ёсць...* могут употребляться со связкой *ёсць* и без нее. При этом они имеют разный смысл. Выражение со связкой обычно обозначает 'лицо чем-то владеет, в его распоряжении что-то имеется' независимо от того, имеется или нет это что-то в данный момент. В таком случае подобные предложения вполне равнозначны выражениям *я маю...: У мяне ёсць новыя кнігі.— Я маю новыя кнігі.* Выражения без связки не равнозначны выражениям *я маю...*, ибо они означают актуализованное владение, т. е. эта вещь находится у лица в данный момент. Такие выражения не заменяются на выражения *я маю: У мяне новыя кнігі* — книги эти со мной, на них можно взглянуть. *У мяне свежыя кветкі* — вот они. Замена таких предложений на предложения с оборотом *я маю...* возможна только в том случае, если существительное в именительном падеже не имеет значения лица: *І ў мяне новы веласіпед — І я маю новы веласіпед.*

Если предмет, названный словоформой в именительном падеже, является неотчуждаемым, т. е. обязательно принадлежит лицу, то предложение, начинающееся с выражения *у мяне ёсць...*, не имеет смысла: *У мяне ёсць твар.* Они вполне осмысленны лишь тогда, когда перед таким существительным имеется определение и отсутствует глагольная связка: *У яго вясёлы твар.*

Предложения этого типа синонимичны также в тех случаях, когда отчуждаемый предмет выражен абстрактными существительными с модальным значением типа *жаданне, надзея, думка, просьба: У мяне ёсць жаданне пачытаць.— Я маю жаданне пачытаць.* В разговорной речи в таком случае глагольная связка *ёсць* может опускаться даже при наличии прилагательных: *У мяне просьба да вас. У сына гарачае жаданне пачытаць.*

Когда в состав предложения входят абстрактные отчуждаемые существительные, не имеющие модального значения, предложения строятся без связки *ёсць* и не имеют синонимичных с выражением *я маю...: У мяне вялікая радасць.* В предложениях типа *Я маю шчасце бачыць вас* слово *шчасце* имеет модальное значение: возможность, счастливый случай.

Слова и выражения

Ранішняя зара́дка — утренняя зарядка.

Лёгкая атле́тыка — легкая атлетика.

Ця́жкая атле́тыка — тяжелая атлетика.

Скачкі́ ў даўжыню́ (вышыню́) — прыжки в длину (высоту).

Спарты́ўная пляцо́ўка (спо́ртпляцо́ўка) — спортивная площадка (спортплощадка).

Пляцо́ўка для гу́льняў — игровая площадка.

Гу́льневыя ві́ды спо́рту — игровые виды спорта.

Хадзём на спабо́рніцтвы плыўцо́ў.— Пошли на соревнования пловцов.

Скаку́н дапусці́ў памылку пры ўвахо́джанні ў ваду́.— Прыгун допустил ошибку при вхождении в воду.

Які́ лік у ку́бкавай (тавары́скай) сустрэ́чы? — Какой счет у кубковом (товарищеском) матче?

Вясляры́ бу́дуць удзе́льнічаць у спабо́рніцтвах па вяславанні на байда́рках.— Гребцы будут участвовать в соревнованиях по гребле на байдарках.

На́шы шаблі́сты — адны́ з ле́пшых у све́це.— Наши саблисты — одни из лучших в мире.

Дваябо́рцы і пяцібо́рцы — спартсме́ны, які́я выступа́юць па двух або пяці́ ві́дах спо́рту.— Двоеборцы и пятиборцы — спортсмены, выступающие в двух или пяти видах спорта.

Ця́жкая атле́тыка развіла́ся з наро́дных сілавы́х гу́льняў.— Тяжелая атлетика развилась из народных силовых игр.

Калі́ два штангі́сты во́зьмуць адно́лькавую вагу́, то пераможцам ста́не той, чыя́ ўла́сная вага́ бу́дзе ме́ней.— Если два штангиста возьмут одинаковый вес, то победителем будет тот, у кого собственный вес меньше.

Падыма́нне ця́жару — поднятие тяжестей.

Адво́льны пістале́т — произвольный пистолет.

Стральба́ па рухо́мых мішэ́нях — стрельба по движущимся мишеням.

Ва́гавая катэго́рыя — весовая категория.

Спарты́ўная барацьба́ — спортивная борьба.

Мала́нкавы (вокамгне́нны) контрудар — молниеносный контрудар.

Бег з перашко́дамі — бег с препятствиями.

Кіда́нне кап'я́ — метание копья.

Кіда́нне мо́лата — метание молота.

Кіда́нне ды́ска — метание диска.

Штурханне ядра́ — толкание ядра.

Ко́лькі ва́жыць ядро́? — Сколько весит ядро?

Са́мыя зая́длыя ама́тары гандбо́лу е́здзяць ра́зам з кама́ндай.— Самые рьяные любители гандбола ездят вместе с командой.

Бале́льшчык — болельщик.

Гледачы́ — зрители.

На́шы няспы́нна атакава́лі, а го́сці то́лькі барані́ліся.— Наши беспрерывно атаковали, а гости только оборонялись.

Гуле́ц (ігро́к) — игрок.

Трэ́нер-гуле́ц — играющий тренер.

Маста́цкая гімна́стыка — художественная гимнастика.

Практыкава́нні з мячо́м, са сту́жкай, з булава́мі, са склака́лкай — упражнения с мячом, с лентой, с булавами, со скакалкой.

Кама́нды: «На старт!» «Ува́га!» — команды: «На старт!» «Внимание!»

Вы́нікі спабо́рніцтва — результаты соревнования.

Асабі́сты залі́к — личный зачет.

Сусве́тны рэко́рд — мировой рекорд.

Ко́лькі се́таў вы́йграла на́ша тэнісі́стка? — Сколько сетов выиграла наша теннисистка?

Двайны́ до́тык да мяча́ — двойное касание мяча.

Па прапано́ве чэмпіёна шахматы́сты пагадзі́ліся на нічыю́. — По предложению чемпиона шахматисты согласились на ничью.

Прапану́ю нічыю́.— Предлагаю ничью.

Стокле́тачныя ша́шкі — стоклеточные шашки.

Ру́скія ша́шкі — русские шашки.

Сустрэ́ча зако́нчылася безвынікова.— Встреча закончилась безрезультатно.

Абаро́нца — защитник.

Напада́ючы — нападающий.

Паўабаро́нца — полузащитник.

Варата́р — вратарь.

Суддзя́ — судья.

ТЕКСТ

Дзед Аўсей і Палашка

(Отрывок из рассказа)

Калі з-пад старой елкі раздаваўся пранозлівы голас:

— А ліханька! А гора ты маё хадзячае! Не лезь ты,

Хрыстом цябе прашу, да печы: не з тваёй жа галавой аладкі пячы! — тады партызаны хітра падміргвалі адзін другому, усміхаючыся:

— Зноў дзед Аўсей пайшоў у наступленне.

Дзед Аўсей быў, як кожны дзед: стары, крыху недачуваў, крыху недабачваў. Але, нягледзячы на свае амаль што семдзесят год, быў яшчэ рухавы, жвавы і гаваркі на ўсю акругу. Апошняя якасць і дапамагла яму, як ён казаў, прышвартавацца да атрада. Падыходзячай вакансіі для яго не было, але дзед быў майстрам на ўгаворы:

— Ты, таварыш камандзір, не сумнявайся... Ты не глядзі, што я па гадах нібыта ўжо ў адстаўцы... Я, брат, матрос з ваеннага карабля. У японскую кампанію, бывала, стаю ля гарматы... Тут табе снарады, тут табе тарпеды, тут табе вада хлешча, тут табе...

— Ну, добра, добра...— І дзеду далі пасаду, паслалі да цёткі Палашкі дапамагаць ёй на кухні. І адразу ж усчаліся там баталіі. Дзед быў не супроць таго, каб устанавіць свой парадак у зямлянцы з кухняй. То яму не падабалася, як Палашка смажыць цыбулю. То яму здавалася, што яна не так запраўляе кулеш. То ён з ярасцю змагаўся за чысціню, змайстраваў спецыяльныя пастаўцы для лыжак, каб яны не валяліся абы-дзе, а былі б пры месцы і заўсёды сухімі.

— Кожная снасць павінна быць на месцы, як на караблі. Аднойчы, яшчэ ў японскую кампанію, калі быў я матросам на ваенным...

— Ты, матрос, вазьмі-тка лепш цэбар ды вынесі памыі...

Горшай абразы не магло быць для дзеда Аўсея, і тут пачыналася гарачая дыскусія:

— Што ты разумееш у ваеннай справе?

— Мне і разумець не трэба... Ты вось бяры лепш цэбар...

— Не, я цябе пытаю, што ты разумееш у караблі? Я, брат, не адну падзяку атрымаў за сваю баявую службу... Я Георгія меў за свае баявыя раны... 'Шчэ цяпер рубцы відаць на жываце, даўжынёй па два пальцы...— і дзед скідаў пояс, каб паказаць гэтай неймавернай Палашцы свае раны. Але тая сарамліва адварочвалася і замахвалася конаўкай:

— Вот ашпару варам, дык будзеш ведаць, як перад чужымі бабамі загольвацца...

— Цьфу ты, нацыя бабская...— нездаволена чмыхаў дзед.— Ты да яе як чалавек, а ў яе сваё ў галаве... Ты мне

не начальнік. Я, можна сказаць, на роўных правах з табой, а можа быць і вышэй... над табой... Што ў цябе? Гаршкі ды палонікі... А пад маім распараджэннем ваенны конь ходзіць...

— Які там конь! — пырскала смехам Палашка.— То ж кабыла нямецкая, ды яшчэ кульгавая...

— Няхай сабе і кабыла, але жывотная воінская...

— Воінская! — не сціхала Палашка.— Знайшоўся мне воінскі начальнік над воінскай кабылай...

Гэта было новай абразай, і дзед кідаўся ў апошнюю атаку:

— Змоўкні ты... Зацірка няшчасная... Вось хто ты! — і ўрачыста пакідаў зямлянку, адвязваў ад хвойкі сваю воінскую жывотную — звычайнага трафейнага каняку, на якім вазіў ён ваду для кухні, і вёў яе на папас.

(М. Лынькоў)

Лексический комментарий к тексту

пранóзлівы — то же, что и *прані́злівы* — пронзительный, резкий
падмíргваць — то же, что и *падмóргваць* — подмаргивать, подмигивать
гармáта — орудие, пушка
пасáда — должность
супрóць — то же, что и *сýпраць* — против
падабáцца — нравиться
змагáцца — бороться, сражаться
пастáўцы — диал., подставка
цэ́бар — ушат
абрáза — оскорбление
падзя́ка — благодарность
сарамлíва — стыдливо, смущенно
кóнаўка — металлическая кружка
вар — кипяток
вéдаць — знать
палóнік — то же, что и *апалóнік* — разливательная ложка, поварешка
кульгáвы — хромой
хвóйка — сосенка
папáс — подножный корм

Упражнения

1. Спишите. Определите, чем выражен главный член предложения. Какой это тип предложения?

Вечарэла. З балот пацягнула цёплай вільгаццю. *(Я. Колас)* На полі не было відаць ні душы. *(І. Новікаў)* І сніцца мне мой родны край, мая далёкая радзіма, кляновы ліст, дубовы гай і ружаваты небакрай, засланы злёгку

белым дымам. *(П. Глебка)* Дрэва без каранёў не бывае. *(Б. Сачанка)* Мяне памалу пераставала цягнуць у дарогу. *(М. Гіль)* Відаць было, што яму перадаваць быўшыя з ім здарэнні надта весела. *(Ц. Гартны)* І мне, старому дзіваку, усё карціць думка, што адно маглі табе там і не сказаць, забыцца. *(У. Карпаў)* Ужо вечарэла. З Нёмана пацягнула цёплым струменем вільгаці. *(П. Пестрак)* На безымянным кургане ім суджана вянком апасці. *(М. Танк)* Добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш! *(Я. Колас)* Зімняе неба сонейкам беліцца, вецер нямее, хмар не відаць. *(Я. Купала)* Не чуваць было ні лёскату машын, ні грукату матораў, ні людскіх галасоў. *(М. Лынькоў)* Хмары сонейка закрылі; зор у ночку не відаць. *(Я. Колас)* Світае. Далеч снежная імгліцца. Аленям не стаіцца на нагах. *(А. Звонак)* Збіралася к начы на дождж. *(К. Чорны)* Як толькі Міхал Тварыцкі ступіў на цвёрдую ўзгоркаватую глебу, яго хаду стала чуць. *(К. Чорны)* Дождж валіў сцяною, і яго шум было чуваць яшчэ здалёк. *(І. Мележ)* Нідзе не відно і не чутно аніводнага чалавека. *(К. Чорны)* Амаль не чутно было, як працуе матор. *(П. Кавалёў)*

2. Определите, какие члены предложения зависят от инфинитива в инфинитивных предложениях. Проследите, как употребляются эти предложения — самостоятельно или в составе сложных конструкций.

Быць бычку на лычку, а кароўцы на вяроўцы. Ім пра вочы вясёлыя граць ды граць да баяне. *(М. Лужанін)* Камень нагой разатрэ на жарству: толькі б стаць добра, толькі б уняцца. *(У. Дубоўка)* Не паспець мне, не ўгнацца сягоння за ім, нешта дзіўнае робіцца з сэрцам. *(А. Куляшоў)* Век жывым звяр'ю не вырвацца і ад помсты не схавацца. *(М. Танк)* Да поўначы раіўся Міколка з дзедам, як лепш справу зрабіць. *(М. Лынькоў)* Без працы жыць — толькі неба капціць. «Падрыхтаваць зброю!» — загадаў Ярка, выслухаўшы Здэнека. *(Т. Хадкевіч)* Вакол спакойна дрэмле поле, блішчыць у росах сенажаць,— не, нашых пожняў больш ніколі чужому танку не таптаць. *(А. Бачыла)* Не звярнуць яму зноў незваротных гадоў, не забыць, хоць ліхой, але — долі сваёй, не закрэсліць той шлях — ад хаўтур да хаўтур, не забыць — ні людзей, ні завей, ні віхур; не закрэсліць жыцця, што было хай цяжкім, але ўсё ж для яго, як сваё, дарагім. *(А. Куляшоў)* Ах, хіба табе зразумець мяне. *(М. Лынькоў)* З ваўкамі жыць — па-воўчаму выць. Убачыць толькі б родны Сож — не шкода ўсё аддаць. *(П. Панчанка)* Звоняць шыбы;

звон — ясны, халодны. Толькі горад стары не пазнаць. *(М. Танк)*

3. Определите, какие предложения относятся к личным, безличным, инфинитивным.

Як хацелася б гэтых пабачыць сяброў: самых сціплых і самых найлепшых! *(У. Дубоўка)* Не рабі ліхога і не бойся нікога. «Задушу!» — хрыпеў ён, як звер, сціснуўшы аб'ездчыка за горла. *(Я. Колас)* Не стаў сабе дачасна помнік і у бяссмерце не спяшы, лаві не ўласнай славы промні, а сонца кожнае душы. *(П. Панчанка)* Ад ручая, з поплава, патыхала вільгаццю і холадам. *(І. Шамякін)* Табе ж ёсць з кім ісці ў кіно. *(К. Крапіва)* Нам, з Зарэчча зарачанцам, век з ракой не разлучацца. *(А. Зарыцкі)* А дарог жа, дарог, ды прасторных якіх, што яснотаю дышуць! *(Я. Колас)* Зайдзі да мяне, Антон. Я напаю цябе вадой. Толькі што прынеслі сіфон. *(І. Шамякін)* Ад дабра дабра не шукаюць. *(К. Крапіва)* На дзень станеш — на два адстанеш. Ну, як цябе зваць? Яська? *(М. Лынькоў)* Працуй. Замяніць цябе сапраўды няма кім. *(І. Шамякін)* Гэтаму чалавеку выпала ў жыцці многа папрацаваць і многа зазнаць. *(І. Мележ)* Спачатку яна трэсла яго за рукі, пасля вельмі порстка нагнулася да яго. *(К. Чорны)* Мусіць, сотні разоў Васіль пісаў на канвертах імя гэтага гарадка. Нарэшце, выпала і пабачыць. *(І. Мележ)* Пачало світаць. На ўсходзе неба пачало ружавець. Ветру не было. Чорны дым паволі валокся над зямлёю. Нават не валокся, а вісеў і ўзнімаўся ўгару. Але дзень ужо вызначыўся. Ён пачынаўся ясным сонцам. Гарматы білі беспярастанку. І раптам секанула ў куст з густым зялёным лісцем. Яго зрэзала, як касою. *(К. Чорны)*

Урок 9

ПРЕДЛОЖЕНИЯ СО СРАВНИТЕЛЬНЫМИ ОБОРОТАМИ

Сравнительные обороты — это слова и словосочетания, которые путем сравнения уточняют смысл других слов или словосочетаний. Они вводятся в общую структуру предложения с помощью специальных союзов *як, бы, нібы (нібыта), як бы, быццам, як быццам, як быццам бы, што, чым, у параўнанні з* и некоторыми другими. Сравнительные обороты могут находиться в начале, середине или в конце предложения: *Быццам у кручыне галаву схіляе старадаўні*

бор. (П. Глебка) У вокнах, нібы на экране, ужо загараецца ранне. (С. Грахоўскі) Сэрца ныла, бы з нуды. (Я. Купала)

Сравнительными оборотами нельзя считать слова и словосочетания, вводимые теми же союзами, но входящие в состав сказуемого: *Хата была як цацка. Яны сталі нібы святыя.*

Своеобразие сравнительных конструкций выявляется уже в тех союзах и соединительных выражениях, с помощью которых они вписываются в общую конструкцию предложения. Их роль сводится не столько к передаче мысли, сколько к созданию образа, который делает мысль более ясной, а речь выразительной. Это — способ украшения речи. Образность сравнительных оборотов особенно ярко обнаруживается тогда, когда в предложении отсутствует основание сравнения: *Светлая хмарка, як ціхая думка шчасця, ціха і спакойна плыла ў небе і зараз жа хавалася ад людзей за высокімі каменнымі дамамі. (Я. Колас) Снапы, што салдаты, стаяць. (П. Броўка) Вярба, як дзяўчына ў каралях, стаіць над вірлівай вадой. (П. Броўка)* Такие обороты и называют образными сравнительными оборотами.

В других случаях сравнительные обороты используются для выражения соответствия, тождественности сравниваемых явлений или наоборот — их несоответствия, нетождественности: *Нідзе так звонка не чуваць спеў жаваранка, як у полі. (В. Быкаў) Шынялі сівыя, як журайлі. (Я. Брыль) Там у іх растуць дужа добрыя антонаўкі, буйныя-буйныя, і ўвосень, як паспеюць, вельмі смачныя, араматныя, усё роўна як крымскія яблычкі. (М. Гарэцкі) Лес тут быў не такі, як на пясчаніку. (І. Мележ) Зоры на ўсходняй старане неба не былі ўжо такія зыркія, як раней. (К. Чорны)* Такие обороты иногда называют сравнительно-параллельными.

Сравнительные обороты этого типа обычно более тесно связаны с определенными членами предложения, что свидетельствует о наличии основания для сравнения. Этому способствует и наличие специальных указательных слов *такі, так* и др.: *Такога палахлівага і баязлівага чалавека, як ён, цяжка знайсці. (Я. Колас) У хаце было так ясна, як у яме. (П. Галавач) У гэты час з палетка падышоў чалавек, вельмі малады, такі самы, як і жанчына. (К. Чорны)* В этих же целях часто используется и усилительная частица *і*, которая подчеркивает соответствие явлений: *Змрок, як і заўсёды ў позьнюю восень, наплываў хутка. (А. Кула-*

коўскі) Пракоп, як і кожны селянін, крыху дыпламат. (Я. Колас) В некоторых случаях усиление сравнения достигается употреблением двух сравнительных оборотов, соединенных бессоюзной связью или связанных союзами *ці, або: Як віхар, як куля, імчыцца каршун. (Я. Купала) У гарадку ўсё кіпела цяпер, як у катле або як у вуллі. (К. Чорны)*

Близкое значение к союзу *як* придает сравнительным оборотам союз *што*, который в целом употребляется относительно редко: *Тут так цёпла, што ў лазні. (М. Гарэцкі) Хлопчык імчаўся, што лёгкая птушка. (З. Бядуля) Шчокі зарумяніліся так, што ў мароз. (Я. Колас)*

Союзы *нібы (нібыта), быццам, бы, быццам бы, як бы* придают сравнительным оборотам значение условности, не полного соответствия, а лишь похожести: *Іван, нахмурыўшыся, паўглядаўся ў гэты зіхатлівы, бы жывое срэбра, рухавы, занадта, на яго думку, прыгожы твар: ці не жартуе яна. (В. Быкаў) А на баку ў цяльняшках паласатых ляжаць, нібы матросы, кавуны. (П. Панчанка) Цёплая летняя ноч павольна апускалася на зямлю і ўсё гусцей і гусцей церушыла над ёю, як бы прасяючы праз танчэйшае сіта малюпасенькія крупінкі змроку. (Я. Колас)* Неполное соответствие может выражаться также и союзом *як* со словом *амаль: У каморцы было холадна, амаль як на двары. (Т. Хадкевіч)*

В художественной литературе 20—30-х гг. нередко можно встретить союзы *мэрам, мэрам бы* (от нем. mehr — больше), которые соответствуют союзам *быццам, быццам бы, нібы* и широко представлены в копыльских, несвижских, клецких и других юго-западных белорусских говорах: *Ціхі нейкі, мэрам да зямлі прыбіты, стаўся Сымон Мігай. (Х. Шынклер) Алеська не адыходзіла ад маткі, мэрам бы баючыся яе адну пакінуць. (Ц. Гартны)* В настоящее время эти союзы не употребляются в литературном языке.

Сравнительные обороты с союзом *чым* подчеркивают бо́льшую или меньшую степень качества или количества предметов или явлений, сравниваемых между собой. Как правило, обороты эти относятся к прилагательным или наречиям в сравнительной степени: *У лесе было многа цяплей, чым у полі. (Ц. Гартны) Сярод жанчын было весялей, чым сярод мужчын. (П.Пестрак)* В художественной литературе часто можно встретить разговорную форму этого союза *чымся: Старыя яшчэ з большай заядласцю*

чымся маладыя, валілі высокія хвоі. (З. Бядуля) Камяніцы бачылі болей, чымся дрэвы і вуліцы. (М. Гарэцкі)

Кроме сравнений, которые присоединяются с помощью союзов, достаточно часто встречаются сравнения бессоюзные. Наиболее распространенным является употребление в качестве сравнения творительного падежа: *На кустах блішчыць шкляным шротам раса. (З. Бядуля) І зной вісіць спакой пераспелай малінай. (Р. Барадулін)*

Сравнительные отношения могут выражаться также с помощью предлогов *з, на, у, на манер* и т. д.: *А сам дарэктар, з вузел ростам, у сваім уборы бедным, простым, у зрэбных портках і кашулі стаяў, як бы яго прыгнулі. (Я. Колас) Нікуды я не пабягу, а сагну яго ў дугу. (А. Чарнышэвіч) Не мог на мак змяць яму косці. (Я. Купала)*

Часто употребляемые сравнительные обороты превратились во фразеологизмы, которые употребляются в качестве обстоятельств:

Нібы (як) снег на галаву — неожиданно, внезапно: *Мой таксама заявіцца сюды як снег на галаву. (А. Кудравец)*

Нібы (як) вады ў рот набраўшы — упорно молчать: *Маўчыць, нібы вады ў рот набраўшы.*

Як асінавы ліст (як асіна) — очень сильно (дрожать): *Цяпер ён калаціўся як асінавы ліст і мусіў сашчаміць зубы, каб не ляскалі. (Я. Колас) Хоць не труслівы я дзяціна, але затросся як асіна. («Тарас на Парнасе»)*

Як бабёр — жалобно: *А к поўначы як бабёр плакала ў печы асіна... (Р. Барадулін)*

Як баран на новыя вароты — растерянно, удивленно: *Таму і глядзеў ён на дзеда Астапа як баран на новыя вароты. (М. Лынькоў)*

Як вадою змыла — исчез, удрал: *Заводчыка Хукмана да гэтага часу як вадою змыла. (К. Чорны)*

Як чорны вол — очень добросовестно, много, упорно: *Сцёпка некалі на пана працаваў як чорны вол... (К. Крапіва)*

Як гром з яснага неба — неожиданно, вдруг, внезапно: *Вайна... Трэція суткі, як яна пачалася. Ударыла як гром з яснага неба, аглушыла, і я ніяк не магу апомніцца. (І. Шамякін)*

Як дзве кроплі вады — очень похожий, одинаковый: *Але вы не ведаеце, што гэты палкоўнік быў падобны на мяне як дзве кроплі вады. (К. Крапіва)*

Як з прывязі сарваўшыся — очень быстро, стремитель-

но: *«Чаго ты ляціш, як усё ройна з прывязі сарваўшыся?» — прысуняў Цітка Кандрат. (М. Лобан)*

Як кашаль хваробе — совсем ненужный, излишний: *Ты паможаш так каню, як хваробе кашаль. (К. Крапіва)*

Як леташні снег — ненужный: *Трэба яна мне як леташні снег. (І. Мележ)*

Як мёртваму кадзіла — бесполезно: *О, каб я цябе злавіў у лесе, то быў бы другі рахунак. А цяпер твая споведзь паможа мне як мёртваму кадзіла. (Я. Колас)*

Як мыла з'еўшы — с кислой миной, неудовлетворенно: *Стафанковічык сціх як мыла з'еўшы. (К. Чорны)*

Як мыш пад мятлою — испуганно, молча: *Госці сядзелі як мышы пад мятлою. (Я. Колас)*

Як на далоні — ясно, четко: *Мястэчка відаць адсюль як на далоні,— вялікае, раскідзістае, яно цягнецца праз усю раўніну ад лесу да лесу. (І. Навуменка)*

Як Пілiп з канапель — внезапно, неожиданно: *Хто ён такі? — Выскачыў як Піліп з канапель. (К. Крапіва)*

Як пугаю па вадзе — бесследно, без результата: *Знак там казне як пугаю па вадзе, ці заплаціць Сомік за карову, ці не. (К. Крапіва)*

Як пшаніцу прадаўшы — очень крепко (спать): *Потым заснуў як прадаўшы пшаніцу, з добрай вячэры і пан не прысніцца... (У. Дубоўка)*

Як рэпу грызці — очень хорошо, без ошибок: *Або Шурка. Дзевяты гадок, чытае як рэпу грызе, і гусі пасе ўсё лета. (Я. Брыль)*

Як след — так, как должно быть: *Не паспелі ў шчасці як след пакупацца мы,— бомбы свіснулі, пырснула першая кроў. (П. Панчанка)*

СЛОВА И ВЫРАЖЕНИЯ

Магазі́н універса́льны, прадукто́вы, прамтава́рны, тытунёвы, кні́жны, канды́тарскі, хле́бны, садаві́нна-гаро́днінны, галантарэ́йны, ві́нна-гарэ́лачны, парфуме́рны, ювелі́рны, мэ́блевы — магазин универсальный, продовольственный, промтоварный, табачный, книжный, кондитерский, хлебный, плодоовощной, галантерейный, винно-водочный, парфюмерный, ювелирный, мебельный.

Калі́ адчыня́ецца (зачыня́ецца) гэ́ты магазі́н? — Когда открывается (закрывается) этот магазин?

Дзе мо́жна купі́ць...? — Где можно купить...?

Ці ёсць у вас...? — Есть ли у вас...?

Пакажыце мне, калі ласка... — Покажите мне, пожалуйста...

Дайце мне, калі ласка... — Дайте мне, пожалуйста...

Дзе ў вас аддзел...? — Где у вас отдел...?

Прадаўшчыца (прадавец) — продавщица, продавец.

Каса, касір (касірша) — касса, кассир (кассирша).

Пакупка — покупка.

Каштаваць — стоить.

Цана — цена.

Зважыць — взвесить.

Адмерыць — отмерить.

Прымерыць — примерить.

Абутак — обувь.

Кашуля — рубашка, сорочка, рубаха.

Сукенка — платье.

Баваўняны, бавоўна — хлопчатобумажный, хлопок.

Дарагі — дорогой.

Танны — дешевый.

Сінтэтычны (штучны) — синтетический (искусственный).

Гальштук — галстук.

Насоўка — носовой платок.

Панчохі — чулки.

Шкарпэткі — носки.

Матэрыял (тканіна) — ткань.

Аксаміт — *бархат.*

Батыст — батист.

Паркаль, паркалёвы — перкаль, ситец; перкалевый, ситцевый.

Гузік ([г] взрывной, как в рус. языке) — пуговица.

Камізэлька — жилет, жилетка.

Паліто з футравым каўняром, скураное — пальто с меховым воротником, кожаное.

Пінжак — пиджак.

Спадніца — юбка.

Штаны — штаны, брюки.

Пакажыце мне вунь тую блакітную блузку. — Покажите мне вот ту голубую блузку.

Хачу прымерыць цёмна-сіні і светла-карычневы касцюмы. — Хочу примерить темно-синий и светло-коричневый костюмы.

Якога колеру блузку вы хочаце? — Какого цвета блузку вы хотите?

Боты — сапоги.

Боцікі — сапожки.

Гу́мавыя бо́ты — резиновые сапоги.

Панто́флі — шлепанцы.

Чаравікі — ботинки, башмаки, штиблеты.

Скураны́, гу́мавы падно́сак — кожаная, резиновая подметка.

Які́ разме́р чараві́каў вы но́сіце? — Какой размер ботинок вы носите?

Ці няма́ і́ншай па́ры з больш высо́кімі абца́самі? — Нет ли другой пары с более высокими каблуками?

Пакажы́це мне со́рак другі́ разме́р.— Покажите мне сорок второй размер.

Які́я нумары́ пальча́так у вас ёсць? — Какие номера перчаток у вас есть?

Вы́пішыце мне, калі́ ла́ска, раху́нак на гэ́тыя тава́ры.— Выпишите мне, пожалуйста, чек на эти товары.

Прашу́ запакава́ць мне вось гэ́тыя паку́пкі ра́зам.— Прошу запаковать мне вот эти покупки вместе.

Да́йце мне, калі́ ла́ска, па́чак са́мых та́нных цыгарэ́т.— Дайте мне, пожалуйста, пачку самых дешевых сигарет.

Ко́лькі кашту́е тыту́нь для лю́лькі? — Сколько стоит табак для трубки?

Прашу́ два па́чкі (дзве каро́бкі) запа́лак.— Прошу две коробки спичек.

Яка́я цана́ га́завай запальні́цы (запальні́чкі)? — Какая цена газовой зажигалки?

А ці ёсць каме́ньчыкі для запальні́чкі? — А есть ли камни для зажигалки?

Я хачу́ набы́ць яшчэ́ дзве по́пельніцы (по́пельнічкі).— Я хочу приобрести еще две пепельницы.

Ён лю́біць куры́ць кубі́нскія цыга́ры, бо яны́ мо́цныя.— Он любит курить кубинские сигары, так как они крепкие.

Мы хаце́лі б набы́ць дыва́н паме́рам 2×3.— Мы хотели бы приобрести ковер размером 2×3.

Нам не хапа́е двух крэ́слаў.— Нам не хватает двух стульев.

ТЕКСТ

Memento mori

Позняй восенню сорак трэцяга года на адным з самых спакойных перагонаў Беларускай чыгункі ўзарваўся нямецкі вайсковы эшалон.

Праз дзень, халодным, золкім досвіткам, бліжэйшую да месца катастрофы вёску акружылі карнікі. Жандары ў

касках і стракатых плашч-палатках і мясцовыя здраднікі-паліцаі ў чорных, прамоклых шынялях прыехалі з райцэнтра на пяці машынах. Вёска была вялікая, але «накрыць» яе ўдалося хутка і спраўна. Як высветлілася значна пазней, уцалела толькі двое: хлапчук, які выпаўз баразной у загуменныя кусты, і дзед, што якраз заначаваў у сваяка на дальнім хутары.

Усе іншыя жыхары сагнаны былі ў той канец вёскі, дзе стаяла старая вялізная адрына,— усё, што ўцалела ад калгаснай фермы.

Зондэрфюрэр, начальнік экспедыцыі, разважыў, што прымусіць «бандытаў» капаць сабе яму — доўгая гісторыя. Значна прасцей спаліць іх у гэтай адрыне. Пакуль яго падначаленыя заганялі вёску ў трое шырокіх варот драўлянай будыніны, ён стаяў трохі збоку, на ўзгорачку, і непрыемна моршчыўся ад дзікага крыку і плачу...

Побач з ім амаль непрыкметна ўздрыгвала ад пранізлівай слаты маладая збялелая перакладчыца.

— Мы хутка скончым гэтае швайнэрай[1], і тады, фройляйн Вэра, паедзем дахаты. Будзе зноў цёпла... О так!..

Істота ў скураным паліто і белай вязанай хустцы выклікала на твар крывое падабенства службова-інтымнай усмешкі.

Так бы ўсё і было, як бывала, аднак, зірнуўшы ў натоўп сваіх ахвяр, што набліжаліся да крайняй ад яго чорнай пячоры варот, зондэрфюрэр заўважыў знаёмага.

— Адкуль я ведаю яго?.. О! Мэншэнскінд[2], дык гэта ж той пячнік! Скажыце, фройляйн Вэра, каб яго падагналі сюды.

Печніка падагналі.

— Біст ду дох аўх гір, майн лібэр кэрль?[3] — засмяяўся начальнік.

Пячнік нічога не зразумеў. Ды, відаць, і не чуў. Бледны, без шапкі на лысіне, абраслы сівеючай шчэццю, ён упёрся ў немца скамянелымі вачыма і маўчаў. Толькі бяскроўныя губы перасмыкаліся, як ад нязбытнага жадання гаварыць.

Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава весела знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя.

[1] Свінства.
[2] Даслоўна — «дзіця чалавечае», адпавядае беларускаму «хлопча».
[3] І ты таксама тут, мой дарагі?

Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр — грубку з белай кафлі. Вось і цяпер ён ледзь не заахкаў на ўспамін аб яе гладкай цеплыні.

— Скажыце яму, фройляйн Вэра, што ён не будзе спалены. Спытайце, ён хоча жыць?

— Спадар зондэрфюрэр кажа, што вы, дзядзька, будзеце жыць. І ён пытаецца, ці вы гэтага хочаце?

Пячнік толькі паварушыў бяскроўнымі губамі.

— І скажыце яму... Спытайцеся, хто ў яго там ёсць.

— Спадар зондэрфюрэр пытаецца, хто ў вас там ёсць? Там — у адрыне?

З вуснаў у чалавека сарваліся словы:

— Там... мая... баба...

— Ён кажа, што там яго жонка.

— Скажыце яму, што жонка яго таксама не згарыць. Ён можа ўзяць яе.

— Спадар зондэрфюрэр кажа, што фрау... што жонку сваю вы можаце забраць.

Бяскроўныя губы ў сівеючай шчэці заварушыліся зноў:

— У мяне там і дачка... з малымі дзет... камі...

— Ён кажа, што там у яго ёсць дачка са сваімі дзецьмі.

— О! Мэншэнскінд! Можа, у яго яшчэ хто-небудзь ёсць?

— Спадар зондэрфюрэр пачынае выказваць нездавальненне. Ён пытаецца, хто ў вас там ёсць яшчэ?

— Скажы яму, што ў мяне там суседзі... А ты скажы, што яны сваякі...

— Ён кажа, што ў яго там многа сваякоў. А таксама суседзі.

— Суседзі?! Эс іст обэр этвас цу ляхен!..[4] Можа, ён хоча, каб я аддаў яму ўсю гэтую банду? Спытайцеся ў яго апошні раз: чаго ён хоча, вар'ят?

— Спадар зондэрфюрэр пачынае злавацца. Вы, дзядзька, не дурыцеся, калі хочаце жыць. Зараз адрыну падпаляць. Ён кажа, што вы, мусіць, хацелі б забраць адтуль усю банду.

Пад чорнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Губы зусім перасталі дрыжаць. Нібыта не сваю, незвычайным жэстам, пячнік узняў галаву:

— А ён што думаў? І ўсіх! Усіх добрых людзей!.. Можа, ён ім роўня — гэты твой гаспадар? Або ты, можа?. Цьфу!..

Чалавек плюнуў пад ногі, тады павярнуўся і ўжо не

---

[4] Гэта ўжо проста смешна!..

тым няпэўным крокам, як сюды, пайшоў да варот адрыны.

Быў нейкі момант разгубленасці, а потым зондэрфюрэр сарваў з правай рукі мокрую скураную пальчатку, адшпіліў кабуру, выхапіў пісталет і прыцэліўся...

У жудасным лямане стрэл амаль не пачуўся.

Але пячнік упаў.

Ён яшчэ ўздрыгваў, калі яго падняли і кінулі цераз плот, пад ногі збою аднавяскоўцаў.

Тады вароты назаўсёды зачыніліся.

І ён згарэў — адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць.

І ён жыве.

(Я. Брыль)

Лексический комментарий к тексту

memento mori — читается [мэмэнто моры] — латинское изречение «помни о смерти». Напоминание о смерти.

чыгу́нка — железная дорога
зо́лкі — промозглый, пронизывающий
ка́рнік — каратель
страка́ты — пестрый
здра́днікі — предатели
спра́ўна — точно, аккуратно, исправно
вы́светліцца — выясниться
сваяк — родственник
жыха́р — житель
адры́на — сеновал
прыму́сіць — заставить, вынудить, приневолить
драўля́ная будыніна — деревянное строение
непрые́мна — неприятно
істо́та — существо
нато́ўп — толпа
ахвя́ра — жертва
заўва́жыць — заметить, приметить
зразуме́ць — понять, постичь, уразуметь
жада́нне — желание
вядо́мы — известный
абшу́кваць — обыскивать
кішэ́нь — жен. р., карман
крэ́сіва — огниво
кава́лак — кусок
атрыма́цца — получиться
гру́бка — голландская печка, голландка
паварушы́ць — пошевелить
ву́сны — уста
нездавальне́нне — неудовольствие, недовольство, неудовлетворение
апо́шні — последний
нарэ́шце — наконец
няпэ́ўны — нетвердый, неуверенный, неопределенный
крок — шаг
разгу́бленасць — растерянность, смятение, недоумение
жу́дасны — жуткий, ужасный, ужасающий
збой — большое скопление, скопление

Упражнения

1. Спишите, подчеркните союзы, с помощью которых присоединяются сравнительные обороты.

Дзень скончыўся не так, як зачаўся. *(Я. Колас)* Ноч такая цёмная, як сажа. *(П. Пестрак)* Буран, як ашалелы, вые. *(М. Танк)* Паўстануць сосны старчмака, гудуць, што ў буралом. *(П. Броўка)* Голас звініць так, што ручаёк. *(І. Шамякін)* Ільны такія белыя — што лебядзіны пух. *(М. Калачынскі)* Дачка заўсёды бліжэй да матчынага сэрца, чым сын. *(А. Чарнышэвіч)* У Надзі былі ўсе падставы не з'яўляцца там, дзе яе асобай маглі цікавіцца больш, чым на гэтай глухой станцыі. *(М. Лынькоў)* Барабаншчык узвышаўся над усімі, нібы капітан карабля. *(І. Шамякін)* Аленка, нібы спалохаўшыся, раптам спыняецца. *(Я. Колас)* Пачакаўшы трохі, нібыта для маскіроўкі, госць нешта запісвае. *(Я. Брыль)* Над тундрай зара зіхаціць залатая, нібыта калыска палярнага дня. *(А. Александровіч)* Бы на краёчку горнай стромы, трапечуць сэрцы юнакоў над кнігай. *(А. Вялюгін)* Вароны ў высі крык заўзяты ўзнялі, бы клянуць сябе. *(Я. Купала)* Полымя, бы знячэўку, шуганула ўверх. *(М. Лынькоў)* Як бы прыглядаючыся, ён спыніўся пасярод вуліцы. *(Я. Колас)* Адтуль, недзе з-за ўзгорку, даносіліся невыразныя, як бы прыдушаныя, гукі. *(К. Крапіва)* Звініць яе голас, быццам ветрык гарэзлівы. *(М. Танк)* Хлопчык моцна засмяяўся, быццам успомніў штосьці смешнае. *(Р. Мурашка)* Такой часінай дня густая, быццам пара, стаіць гарачыня. *(П. Глебка)* Ясныя зоркі, быццам дзяўчаткі, скрозь іх валокны глядзяць. *(Я. Колас)* Як быццам спуджаны, маўчыць сасняк. *(М. Машара)* Фурманка, як быццам мурашка, паволі выпаўзала з далёкага лесу *(К. Чорны)*

2. Определите, в каких случаях употреблены сравнительные обороты, а в каких фразеологические выражения. Предложения с фразеологизмами выпишите.

Яхіма як бы па галаве абухам стукнула. *(Я. Колас)* Ён паў над жоўтымі пяскамі, як быццам задрамаў *(П. Броўка)* Прачытала я гэта — і мяне як агнём апякло... *(В. Палтаран)* Як мыла з'еўшы, ён паклыбаў далей *(К. Чорны)* Мікола ўсхапіўся з пасцелі, як непрытомны. *(Я. Колас)* Учора да вечара я памагаў. Помачы ад мяне, ад калекі няшчаснага, як ад казла малака *(Я. Брыль)* Цяпер ён стараўся трымацца са мною як таварыш. *(М. Га-*

рэцкі) Вялікае, як навальніца, шчасце ахапіла яго. *(К. Чорны)* Як па старонках кніг, па гонях чытаю літары слядоў. *(П. Глебка)* Аднаму баязліўцу давялося ісці ноччу цераз лес, у небаракі аж зубы ляскалі і сам ён калаціўся як асіна. *(К. Крапіва)* Усе сцягнуліся бліжэй адзін да аднаго, людзей нібы пабольшала, але што ж, калі без патронаў як без рук... *(М. Гарэцкі)* Вецер, убраўшыся ў сілы, лесам, як вехцем, трасе. *(Я. Купала)* Далёка-далёка, як з-пад зямлі, даносіўся сабачы брэх. *(Я. Колас)* Жука і Барадатыча як вадой змыла — уцяклі ў кусты ад пчол. *(М. Лынькоў)* А што было, тым часам, рабіць, калі ўсе маўчалі як вады ў рот набраўшы? *(І. Мележ)* Вы не ведаеце яго. Ён жа такі — хворы не хворы, а цягне як вол. *(А. Макаёнак)* Я гляджу на акардэон, як на штосьці жывое. *(М. Ракітны)* Меднастволы, як выліты, высіцца бор. *(П. Панчанка)* А што ён працаўнік, і гэтакі й такі, дык ясна тут як двойчы два: вы з ім, здаецца ж, сваякі — жывёлы з аднаго хлява. *(К. Крапіва)* Згушчаліся хмары, аблажыла ўсё неба, стала цёмна, як у калодзежы, загрукацеў гром, бліснула маланка, і як з вядра лінуў дождж. *(І. Гурскі)* Трэба яна мне як леташні снег!.. *(І. Мележ)* А што вы, разумныя? Хоць бы ты, Сымон? Таўпехаецеся як Марка па пекле ці як мухі ў смале і больш нічога. *(Я. Купала)*

3. Определите, в каких предложениях слова, присоединяемые союзами *бы, нібы, нібыта, што, як, як бы, як быццам,* входят в состав сказуемого, а в каких являются сравнительными оборотами.

У вёсцы стала ціха і панура, як у магіле. *(М. Лынькоў)* Ноч была нібы казка. *(К. Чорны)* Па пустой, нібы ахутанай імглою, вуліцы з пагашанымі фарамі праімчала аўтамашына. *(У. Карпаў)* Уся сцяна нібыта шкляная. *(Т. Хадкевіч)* Лёд, бы камень самацветны, блішчыць праменнаю ігрой. *(А. Звонак)* Дзяўчына — бы ягадка тая. *(М. Танк)* Хата ў іх цяпер што клуб той. *(І. Шамякін)* Вадзіцель глядзіць так, што вар'ят. *(І. Мележ)* Дрэвы як быццам зацвілі залацістымі кветкамі. *(У. Шахавец)* Яна як быццам іграла пальцамі, вырываючы свірэпку, выкалупваючы з зямлі карэнні асоту і пырніку. *(Т. Хадкевіч)* Само балота як бы замерла ў сваёй адвечнай зацятасці. *(Я. Колас)* На ўроках мы займаліся чым папала. *(Я. Скрыган)* Заўвагі накіроўваліся больш на самога Мікуця, чым на яго прамову. *(К. Чорны)* Гэта ён скарэй падумаў, чымся выгаварыў. *(З. Бядуля)*

4. Прочитайте, обращая внимание на знаки препинания при сравнительных оборотах.

Як хвалі шырокага мора, плывуць нашай славы гады. *(Я. Колас)* Як гром, здалёк чуліся гарматныя стрэлы, і, як маланка, узрываліся ў цёмным небе ракеты. *(В. Каваль)* Усе вучні імкнуліся вучыцца як мага лепш, не заставацца ззаду ад сваіх сяброў. *(У. Дубоўка)* Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. *(І. Мележ)* Нібы сотні схаваных у траве конікаў, застукалі ў дварах малаткі касцоў. *(К. Крапіва)* Ён меў права затрымлівацца ў адным месцы не больш чым на суткі. *(Я. Брыль)* У хаце сумна, бы ў няволі. *(М. Чарот)* Яна адказала і занялася сваімі справамі, як бы не хочучы заводзіць асаблівых дыскусій з бацькам. *(М. Лынькоў)* Вячэра часта праходзіла як бы на святочным узроўні. *(К. Чорны)* Яны ішлі быццам на маёўку. *(М. Гарэцкі)* Гэта слова прымае як быццам неўласцівую для сябе аснову. *(М. Лужанін)* Па-над белым пухам вішняў, быццам сіні аганёк, б'ецца, уецца шпаркі, лёгкі сінякрылы матылёк. *(М. Багдановіч)* Дзень выдаўся як на заказ. *(І. Мележ)* Сад быў скалечаны не менш, чым хвойнік. *(І. Шамякін)*

Урок 10

СРЕДСТВА СВЯЗИ В СЛОЖНОМ ПРЕДЛОЖЕНИИ

Сложные предложения образуются из форм простых предложений обычно при помощи различных специальных союзов и других соединительных средств (слов и сочетаний слов). Эти средства выражают вид связи составных частей сложных предложений и одновременно конкретные отношения между тем, что в этих частях сообщается. В них преимущественно заключается своеобразие белорусского языка в построении сложных предложений.

1. В сложносочиненных предложениях наиболее употребительными являются союзы *і* — и, *ды* — но, да, *а* — а, *алé* — но, однако: *Ноч была глыбокая, і цішыня навокал была жудасная. (К. Чорны) Майчала возера ў тумане, ды вербы плакалі ў цішы. (П. Трус) І там добра, і тут някепска. (А. Кулакоўскі) Смачны жабе арэх, ды зубоў Бог не даў. (К. Крапіва) Нецярпліва жджэ хлапчына, ды не скора вечарок. (Я. Колас) Граў Сымонка, а дзед слухаў. (Я. Колас) Будзь смелым, як бура, што крышыць дубы, а будзе твой верх, тваё права ўсягды. (Я. Купала) Стуку*

подпіс прозвішча

Галоўны бухгалтар ____________ ________________
подпіс *прозвішча*

«____»__________________19____г.

СЛУЖЕБНЫЕ ПИСЬМА

Служебные письма обычно пишутся на бланках учреждения. В их состав входят:

1) наименование адресата (им может быть учреждение или его структурное подразделение либо конкретное должностное лицо);
2) дата и исходящий номер письма;
3) ссылка на номер и дату входящего документа;
4) подзаголовок (для длинных писем);
5) текст письма;
6) приложение;
7) подпись.

Если письмо адресуется учреждению или его структурному подразделению, то наименование адресата пишется в именительном падеже. Если оно адресуется руководителю, то должность адресата пишется в дательном падеже.

Письмо пишется обычно на бланках учреждения. Если оно не вмещается на одном листе, то продолжение печатается на обычном листе бумаги с обозначением страницы 2. Можно также печатать продолжение на оборотной стороне листа. В этом случае делается правое поле, равновеликое левому полю на лицевой стороне. Подписи без текста переносить нельзя.

Ад 25 мая 1993 г. № 143/05

Міністэрства сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь

Аб спісах выпускнікоў, якія рэкамендуюцца інстытутам на навуковую работу

У 1993 годзе Мазырскі сельскагаспадарчы інстытут заканчваюць 5 чалавек па розных спецыяльнасцях, якія праявілі схільнасць да навукова-даследчай работы. Іх навуковыя работы, выкананыя за час вучобы ў студэнцкіх навуковых таварыствах і на кафедрах інстытута, атрымалі высокую ацэнку з боку спецыялістаў навукова-дасле-

чых устаноў. Вынікі іх даследаванняў праверaны на доследных дзялянках інстытута і таксама ацэньваюцца станоўча.

У сувязі з гэтым рэктарат просіць знайсці магчымасць уладкаваць іх на працу на абласныя сельскагаспадарчыя станцыі і ў навукова-даследчыя арганізацыі міністэрства.

Дадатак: Спіс выпускнікоў, якія праявілі схільнасць да навукова-даследчай работы.

Рэктар
доктар сельскагаспадарчых навук
прафесар *А. П. Пятрэнка*

Ад 6 мая 1993 г. № 12/06

Галоўнаму інжынеру
Магілёўскага завода
шасцерняў Яўневічу П. В.

Вашы прапановы па ўдасканаленні тэхналагічнай лініі ў цэху № 5 разгледжаны ў Навукова-даследчым інстытуце машынабудавання і прызнаны слушнымі.

У сувязі з гэтым Калегія міністэрства прыняла рашэнне даручыць Мінскаму станкабудаўнічаму заводу вырабіць неабходнае абсталяванне на працягу г. г.

Вашаму заводу на 1994 год будзе прадугледжана дадатковае фінансаванне для наладкі гэтага абсталявання.

Нам. міністра *М. П. Стральцоў*

Рыхтаваў: Грамыка І. І.
тэл. 33-33-33

АКТ

Это документ, который составляется комиссией или отдельным лицом в подтверждение каких-либо фактов или событий, связанных с деятельностью учреждения или лица. Составляется на бланках или на обычном листе бумаги.

Зацвярджаю:

*Дырэктар завода*________________*І. Пятровіч*

30.03.1993

Акт

21 лістапада 1993 г.

Камісія ў складзе начальніка цэха № 5 Сідарэвіча П. К.— старшыні, членаў — загадчыка склада Кунцэвіч В. І. і бухгалтара Пятровай В. П., прызначаная загадам дырэктара завода № 15/Д ад 13 лістапада 1993 года, у прысутнасці загадчыка аддзела Кіслюк В. І. зрабіла праверку расходу паперы і фінансавых сродкаў у аддзеле аператыўнай паліграфіі.

У ходзе праверкі ўстаноўлена наступнае.

Агульнае фінансаванне аддзела аператыўнай паліграфіі склала 2000 тыс. рублёў, з іх фонд заработнай платы склаў 40 %, або 800 тыс. рублёў. На набыццё паперы выдаткавана 400 тыс. рублёў, на рамонт абсталявання 100 тыс. рублёў, на набыццё іншых паліграфічных матэрыялаў зрасходавана 200 тыс. рублёў. Усе затраты зроблены ў адпаведнасці з зацверджаным каштарысам на 1993 год. Астатак фінансавых сродкаў на 20 лістапада 1993 г. складае 600 тыс. рублёў.

Набытыя 10 тон паперы зрасходаваны наступным чынам: 5 (пяць) тон — на размножванне тэхнічнай дакументацыі, якая выдадзена ў цэхі, галоўнаму канструктару і дырэкцыі; 3 (тры) тоны — па распараджэнні намесніка дырэктара Іванова П. І. на друкаванне вучэбных дапаможнікаў для ПТВ № 123 і 1 (адна) тона на друкаванне завадской шматтыражнай газеты. На складзе ў наяўнасці 1 (адна) тона паперы. Усе расходы належным чынам афармлены дакументальна.

Злоўжыванні або парушэнні фінансавай дысцыпліны не выяўлены.

Акт складзены ў 3 экз.

Старшыня камісіі	*Сідарэвіч П.К.*
Члены камісіі	*Кунцэвіч В. І.*
	Пятрова В. П
Загадчык аддзела аператыўнай паліграфіі	*Кіслюк В. І.*

Форма № ОС-4

Зацвярджаю

____
назва ўстановы

____
подпіс кіраўніка

Акт №
аб ліквідацыі асноўных сродкаў ______________19____г.

*ад*______________*19*____*г.*

Інвентарны №	*Устанoва*	*Дэбет*		*Крэдыт*		*Сума*	*Знос*
		сінтэтычны рахунак	*шыфр*	*сінтэтычны рахунак*	*шыфр*		

____

____

*Камісія ў складзе*______________________________
пасада, прозвішча

____

____

*прызначаная загадам (распараджэннем)*____________

____

*ад*____________*19*____*г., №*__________*на падставе*______

__________*агледзела*______________________________
назва аб'екта

і знайшла яго падлеглым ліквідацыі (разборцы) па наступных прычынах:

1. *Год вырабу або пабудовы 19*____*г.*
2. *Паступіў на прадпрыемства «*____*»*________*19*____*г.*
3. *Уведзены ў эксплуатацыю ў*____________*19*____*г.*
месяц
4. *Капітальных рамонтаў праведзена*________*на суму*
колькасць

__________*рублёў.*

*5. Тэхнічны стан і прычыны ліквідацыі*____________

____

____

*6. Заключэнне камісіі:*__________________________

____

____

*Дадатак: пералік прыкладзеных дакументаў*__________

____

*Члены камісіі*__________ __________________ ________

пасада *прозвішча, ініцыялы* *подпіс*

__________ __________________ ________

пасада *прозвішча, ініцыялы* *подпіс*

__________ __________________ ________

пасада *прозвішча, ініцыялы* *подпіс*

На оборотной стороне:

Разлік вынікаў ад ліквідацыі аб'ектаў

Выдаткі па ліквідацыі			*Паступіла ад ліквідацыі*			
назва дакументаў	*артыкулы выдаткаў*	*сума*	*назва дакументаў*	*віды каштоўнасцей*	*кольказсць*	*сума*

*Сума зносу, руб.*______________

*Вынікі ад ліквідацыі*______________________________

У карце выбыцця асноўных сродкаў адзначана

«____»________________19____г.

*Галоўны (старшы) бухгалтар*__________

подпіс

ТРУДОВОЕ СОГЛАШЕНИЕ

Если в учреждении нет работников, которые могут выполнить какую-либо необходимую работу, то руководство может привлечь за определенное вознаграждение стороннего работника на срок выполнения этой работы. Такая временная работа оформляется трудовым соглашением. Оно пишется на обыкновенном листе бумаги в двух экземплярах: один остается в учреждении, другой отдается исполнителю. Образец:

Працоўнае пагадненне

г. Мінск *14 сакавіка 1993 г.*

Інстытут паліталогіі Акадэміі навук Беларусі ў асобе дырэктара акадэміка Пятровіча А. М., з аднаго боку, і стэнаграфістка Атрахімовіч Валянціна Іванаўна, жыхар г. Мінска, пр. Ф. Скарыны, д. 5, кв. 10, пашпарт сер. ІІ-ВН, № 151719, з другога боку, заключылі працоўнае пагадненне аб наступным:

1. Стэнаграфістка Атрахімовіч В. І. абавязуецца застэнаграфаваць і расшыфраваць выступленні вучоных на навукова-практычнай канферэнцыі «Праблемы палітычнай улады ў краінах СНД».

2. Інстытут паліталогіі абавязуецца выплаціць стэнаграфістцы Атрахімовіч В. І. за стэнаграму і яе расшыфроўку кожнай гадзіны работы канферэнцыі 500 (пяцьсот) рублёў.

3. Працоўнае пагадненне складзена ў двух экземплярах.

Дырэктар Інстытута
паліталогіі акадэмік *А. М. Пятровіч*
Стэнаграфістка *В. І. Атрахімовіч*

ПРОТОКОЛ

Протокол является документом, который отражает вопросы, заслушанные и обсужденные на каком-либо собрании, заседании или совещании. В нем кратко излагается сущность вопроса (если делался доклад, то он обычно прилагается к протоколу), передается изложение выступлений и записывается постановление в окончательной формулировке.

Пратакол
справаздачна-выбарнага сходу прафсаюзнай арганізацыі Інстытута паліталогіі Акадэміі навук РБ

21.10.93 № 3

Прысутнічалі: з 101 члена па спісу прафсаюзнай арганізацыі 82 чалавекі (рэгістрацыйны ліст прыкладаецца).
Старшыня — Сазановіч М. М.
Сакратар — Курылава М. І.

Парадак дня:

1. Справаздача прафкома за перыяд з 09.11.92 г. па 20.10.93 г.
2. Справаздача рэвізійнай камісіі.
3. Выбары новага складу прафкома.

1. Слухалі:
старшыню прафкома Бурака І. Л., які зрабіў справаздачу аб дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі і прафкома за перыяд пасля папярэдніх перавыбараў прафкома (справаздача прыкладаецца).
Пытанні:
Іваноў В. В.: Колькі дзяцей супрацоўнікаў інстытута адпачывалі ў гэтым годзе за межамі Беларусі?
Адказ: За межы Беларусі на адпачынак і ўмацаванне здароўя ў справаздачны перыяд мы змаглі адправіць усяго траіх дзяцей нашых супрацоўнікаў (у Фінляндыю).
Новік Г. Н.: Як выкарыстоўвалася спартыўная маёмасць?
Адказ: Са спартыўнай маёмасці прафком мае лыжы і шахматы. Яны выдаваліся ў карыстанне па запатрабаванні членаў прафсаюза і для ўдзелу ў спаборніцтвах.
Выступілі:
Верабей П. П.— старшыня культурна-масавай камісіі.
За справаздачны перыяд камісія арганізавала дзве экскурсіі па памятных мясцінах Міншчыны, тры разы наведвалі спектаклі ў тэатры імя Янкі Купалы, была арганізавана выстаўка малюнкаў дзяцей нашых супрацоўнікаў. Практыка паказвае, што калектыўныя культурна-

масавыя мерапрыемствы зараз не ў модзе. У сувязі з гэтым не ўдалося ажыццявіць наведванне мастацкай выстаўкі беларускага мадэрну, шэраг іншых мерапрыемстваў. У сувязі з дарагімі цэнамі білетаў будучаму прафкому трэба планаваць значна больш сродкаў на культурна-масавую работу.

Казначэева М. П.

Не заўсёды справядліва прафком размяркоўвае пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый «Ісдач». Так, я некалькі гадоў стаю ў чарзе, а ў верасні пуцёўку размеркавалі супрацоўніку, які стаіць у чарзе пасля мяне.

Таким образом оформляются и другие выступления.

1. Пастанавілі:

1. Прызнаць работу прафкома за справаздачны перыяд здавальняючай.

Далее перечисляются пункты постановления в той формулировке, которую одобрило собрание.

2. Слухалі:

старшыню рэвізійнай камісіі, які зрабіў справаздачу аб фінансавай дзейнасці прафкома (прыкладаецца).

2. Пастанавілі:

Зацвердзіць справаздачу рэвізійнай камісіі аб фінансавай дзейнасці прафкома за перыяд з 09.11.92 г. па 20.10.93 г.

3. Слухалі:

***Сазановіча М. М.** аб выбарах новага складу прафкома.*

Прапаную выбраць новы прафком у складзе 7 чалавек адкрытым галасаваннем, старшыню прафкома выбраць на сходзе.

3. Пастанавілі:

1. Выбраць прафком у складзе 7 чалавек.

2. Выбары праводзіць адкрытым галасаваннем.

3. Падлік галасоў даручыць прэзідыуму сходу.

4. Старшыню прафкома выбраць на сходзе.

Вынікі галасавання:

старшыня прафкома Бурак І. Л. (за 79, супраць 1, устрымалася 2);

члены прафкома:

1. Верабей П. П. (за 75, супраць 4, устрымалася 3)

2. Козлік Р. Р. (за 82, супраць няма, устрымалася — няма)

и т. д.

3. Пастанавілі:

У адпаведнасці з Інструкцыяй аб правядзенні выбараў прафсаюзных органаў лічыць выбранымі ў прафком:

Бурак І. Л.— старшыня прафкома

Верабей П. П.— член прафкома

Козлік Р. Р.— член прафкома

и т. д.

Далее в протоколе отражается избрание ревизионной комиссии.

Старшыня сходу *Подпіс* *М. Сазановіч*

Сакратар *Подпіс* *М. Курылава*

Форма выписки из протокола:

Выпіска з пратакола

справаздачна-выбарнага сходу прафсаюзнай арганізацыі Інстытута паліталогіі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь

21.10.93, № 3.

1. Слухалі: справаздачу рэвізійнай камісіі.

2. Пастанавілі: зацвердзіць справаздачу рэвізійнай камісіі аб фінансавай дзейнасці прафкома за перыяд з 09.11.92 па 20.10.93.

Старшыня сходу — М. Сазановіч

Сакратар — М. Курылава

Выпіска згодна з арыгіналам:

Сакратар *Подпіс* *Р. Козлік*

30.10.93

ПРИКАЗЫ

Приказы в учреждениях, организациях и на предприятиях издаются руководителями по самым различным вопросам. Они пишутся на специально изготовленных бланках, на общих бланках или на обычной писчей бумаге. В последнем случае сверху указывается наименование министерства или ведомства и учреждения. Далее посередине пишется слово «Приказ», ниже дата, город, номер приказа. Потом указывается, о чем издается приказ. Затем идет сам текст приказа.

Міністэрства харчовай прамысловасці
Галоўнае ўпраўленне

Загад № 6

20.03.93 *г. Мінск*

Па кадравых пытаннях

§ 1

Залічыць Абуховіч Галіну Пятроўну на пасаду старшага бухгалтара з 1 красавіка 1993 г. з месячным выпрабавальным тэрмінам. Вызначыць Абуховіч Г. П. у адпаведнасці са штатным раскладам месячны аклад у суме 20 тысяч рублёў.

Падстава: заява Абуховіч Г. П. ад 10.03.93.

§ 2

Вызваліць Казакевіча Рыгора Іванавіча ад абавязкаў старшага бухгалтара з 31 сакавіка 1993 г. па яго ўласнаму жаданню (арт. 31 КЗаП РБ).

Падстава: заява Казакевіча Р. І. ад 01.03.93.

§ 3

Дазволіць сакратару-машыністцы Верабей І. М. чарговы штогодні водпуск з 8 лютага па 2 сакавіка 1993 г. за перыяд з 11.10.92 г. па 11.10.93 г.

Падстава: заява Верабей І. М., графік водпускаў на 1993 г.

§ 4

За высокія паказчыкі ў вытворчай працы аб'явіць падзяку сакратару-машыністцы Верабей І. М.

Начальнік упраўлення *П. Сідарчук*

Каждый из перечисленных выше параграфов может быть оформлен и как отдельный приказ.

Во многих приказах по административным и хозяйственным вопросам, по вопросам труда и заработной платы и т. п. должна быть вводная часть, в которой обычно раскрываются причины, побуждающие издавать приказ. В остальном их оформление аналогичное. Приказ никому на руки не выдается, но заинтересованные лица вправе потребовать копию касающегося их параграфа. В таком случае делается выписка. Ниже приводится образец выписки.

Міністэрства харчовай прамысловасці
Галоўнае ўпраўленне

Выпіска з загада
па кадравых пытаннях

20.03.93 *г. Мінск* *№ 6*

§ 2

Вызваліць Казакевіча Рыгора Іванавіча ад абавязкаў старшага бухгалтара з 31 сакавіка 1993 г. па яго ўласнаму жаданню (арт. 31 КЗаП РБ).

Падстава: заява Казакевіча Р. І. ад 01.03.93.

Начальнік упраўлення — *П. Сідарчук*
З арыгіналам згодна: сакратар — *Г. Ермаловіч*
25.03.93

РЕШЕНИЯ И ПОСТАНОВЛЕНИЯ

Эти документы издаются обычно коллегиальными органами и пишутся на типографском бланке организации или органа. В соответствии с энциклопедическим словарем юридических терминов постановления обычно принимаются высшими органами законодательной и исполнительной власти, решения — всеми остальными. Однако на практике это разграничение строго не выдерживается: на основе своих установок и не высшие органы издают постановления. В принципе оформление этих документов одинаково.

Рашэнне
18 верасня 1993 г. № 56
г. Энск
Аб будаўніцтве жылога дома
ў г. Энску па вул. М. Багдановіча
на 56 кватэр агульнай плошчай
2500 кв. м.

Выканаўчы камітэт гарсавета рашыў:
Прасіць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:

1. Зацвердзіць праект жылога дома на 56 кватэр агульнай плошчай 2500 кв. м па вул. М. Багдановіча ў г. Энску.

2. Зацвердзіць каштарыс на будаўніцтва названага ў п. 1 жылога дома ў суме 200 мільёнаў 890 тысяч рублёў.

Старшыня выканаўчага камітэта гарадскога Савета народных дэпутатаў — *Подпіс А. Якіменка*

Кіраўнік спраў — *Подпіс Л. Калодкіна*

Выписка из решения или постановления делается так же, как и выписка из приказа и протокола.

Энскі гарадскі Савет народных дэпутатаў
выканаўчы камітэт

Выпіска з рашэння

ад 18.09.93 *№ 56*

г. Энск

Аб будаўніцтве жылога дома
ў г. Энску па вул. М. Багдановіча
на 56 кватэр агульнай плошчай 2500 кв. м.

Выканаўчы камітэт гарсавета рашыў:
Прасіць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:
2. Зацвердзіць каштарыс на будаўніцтва названага ў п. 1 жылога дома ў суме 200 мільёнаў 890 тысяч рублёў.

Старшыня выканаўчага камітэта
гарадскога Савета народных
дэпутатаў *А. Якіменка*

Кіраўнік спраў *Л. Калодкіна*

З арыгіналам згодна:
Сакратар *Подпіс* *А. Яфрэменка*

ДЛЯ КРАСНОГО СЛОВЦА

Знание языка — это свободное владение его словарем, грамматикой и их звуковым и письменным воплощением (фонетика и письмо) для построения различных составных языковых образований при высказывании (и понимания при восприятии речи). Однако в речевом общении не всегда создаются или творятся необходимые словосочетания и предложения. Речь характеризуется также широким использованием готовых, многократно испытанных речевых единиц, хорошо отшлифованных по своему значению и языковому (лексическому и грамматическому) воплощению. Многие из них представляют собой устойчивые составные речевые образования, глубокие и яркие по смыслу и нередко необычные по своей семантической и лексико-грамматической конструкции. Это пословицы и поговорки, фразеологические единства слов, сравнения, устойчивые обороты речи, перифразы, афоризмы и т. д. Они оживляют речь, могут придать ей особую свободу, естественность и непринужденность, а также выразительность и красоту. Их можно назвать средствами красноречия в языке.

Такого рода средства белорусского красноречия *(красамоўства)* содержат эти небольшие тематические выборки из богатейших сокровищниц белорусской письменной литературной и диалектной речи.

ПОСЛОВИЦЫ И ПОГОВОРКИ

О ТРУДЕ

Работа ў ахвоту, ды дзень мал.
Работа — не забота: забота, калі няма работы.
На свеце як бывае? Хто працуе, той мае.
Мацей, папацей, калі хлеба захацеў!
Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.
Той харош, хто для справы гож.
Працуй, нябожа, то і Бог паможа.

За што добра бярэшся, канца даб'ешся.
Паміраць збірайся, а жыта сей.
Пчолы пчалмі, але і сам не спі!
Кепская снасць адпачыць не дасць.
Каму прырупіць, вочы пралупіць.
Ранняя пташка зярняткі клюе, а позняя — вочкі трэ.
Скоры паспе́х людзям на смех.
Гуляй, галота, калі ахвота: якая плата, такая й работа.
Працуй да поту — з'ясі ў ахвоту.
Вала клічуць не мёд піць, а вазы вазіць.
Каторы конь цягне, таго і паганяюць.
Добра ўсё ўмець, але не ўсё рабіць.
З музы́кі хлеб невялікі.
Умей танчыць, а рабіць гора навучыць.
Мазалёвай працай не здабудзеш палацаў.

О РОДИНЕ И ЧУЖБИНЕ

Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
Мілы той куток, дзе вязалі пупок.
Дома і салома ядома.
Кожны кулік жыве, дзе прывык.
Дабра на Дану, ды лепей у даму.
На чужыне і камар гіне.
На чужой старане паклонішся й баране.
І дома не мёд, але ж і ў чужых не піва.
Што сяльцо, то нараўцо, што хутарок, то гаварок.

О ЧЕЛОВЕКЕ В ОБЩЕСТВЕ

Папаў у вараны́ — каркай, як яны.
З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.
Хоць наза́дзе, абы ў стадзе.
З міру па нітцы — голаму сарочка.
Не той сябра, хто мёдам мажа, а хто праўду кажа.
Добра карміць сытага, а галіць лысага.
Так у госці звалі, аж рукавы́ адарвалі.
І пірагоў шкода, і гасцей сорам.
Госць, не госць, а калатні досць.
Начлег з сабой не носяць, а ў людзей просяць.

О СОБСТВЕННОСТИ

На сваім сметніку і верабей гаспадар.
Усё тут наша, толькі мы яму не свае.
Тады маю, калі ў руках трымаю.

Купіў бы сяло, ды грошай гало
Паехаў бы на кірмаш, ды грошай нямаш
За свой грош усюды харош.
Чэшацца, свярбіцца — хочацца разжыцца.
Меў бы ніву — знаў бы і сілу.
На ваўку добры кажух, ды прышыты.
У лысага чуб не пазычыш.
Як ёсць сіла, дык і за мяжой ніва.
Не таму згалелі, што елі, а таму, што ліхадзеі тоўстае горла мелі.
Была ў сабакі хата, ды ад дажджу згарэла
Які бот не скурат, але лапцю не брат.
Я свістаў, пакуль ад цябе дастаў, а цяпер ты пасвішчаш, пакуль з мяне зышчаш.

О ДОСТОИНСТВАХ

Шчыраму і чужая болька колка.
Добраму чалавечку добра і ў запечку
Добрыя вочы не баяцца дыму.
Добраму толькі кіў, а на лядашчага трэба кій
Адвага або мёд п'е, або кайданы трэ.
Старожа лепей варожы.
Хіцер Зміцер, але ж і Саўка — не дурак.
Ласкавае цяля дзвюх матак ссе.
Ад паклону галава не балела нікому.
Не чорт вінаваты, што тараваты.
Рахуба — не згуба.
На яго дзе сядзеш, там і злезеш.
Гразь не сала: пацёр, і адстала.
Маўчок — пятачок, а два маўчкі — грывеннік.
У закрыты рот муха не заляціць.
Разумныя жарты пахвалы варты.
Зерне да зерня — будзе поўная мерня.

О НЕДОСТАТКАХ И ПОРОКАХ

З ліхім чалавекам і гадзíна (можа здацца) векам
У ліхога пчаляра і мёд горкі.
Які Сава, такая і слава.
Слоў мяшок, а спраў — на вяршок
Мякка сцеле, ды мулка спаць.
Як свінню ні кліч, выдасць лыч.
Разумная галава, ды на дурной шыі.
Вырас пад неба, а дурны, як трэба.

За дурною галавою нагам няма спакою
Усякі гад на свой лад.
Хоць і не звер, ды чорт яму вер.
Завіднае вока бачыць далёка.
Пусці нахабу пагрэцца, то й самому няма дзе дзецца.
Есці дай, а работы не пытай.
Стук, грук — абы з рук.
Як баішся, дык і ліха не мінеш, і надрыжышся.
Баязліваму і корч — мядзведзь.
Гарбатага магіла спраміць.
Сядзіць моўча, ды дума ў яго воўча.
Пайшоў Апанас па квас, дык ні Апанаса, ні квасу
У яго са сваім хлебам паабедаеш
Пралазу відаць адразу.
Такі свет настаў: ні палажы, ні пастаў
Не заглядáйся на чужых жонак: не скасееш, дык здурнееш.
Не будзь ласы на чужыя каўбасы.
На пахілае дрэва і козы скачуць

ШУТКИ И ОСТРОТЫ

На Беларусі пчолы, як гусі, а гусі, як валы́.
Не крычы моцна: у пастухі возьмуць.
Усе — ну ды ну, а тпрукаць няма каму.
Грыбкі, на бакі, ідуць баравікі!
Трымайся за грыву, бо за хвост не ўтрымаешся.
Рука руку мые, а чорт чорта крые.
У астрог шмат дарог.
Дзякуй, не дзякуй, а заплаці́ць мусіш
Дай, Божа, мне, а іншым — не
Мой мілы спакою, добра мне з табою.
Паздароў, Божа, гасцей, каб ездзілі часцей.
Было піць і есці, толькі прынукі не было.
Не таго шкода, што з'елі, а таго, што асталося.
Не ганю, а проша вон!
Дзе гам, і я там.
Прасіць прасілі, а каб паднасіць — не паднасілі
Прыходзь у госці, кума, калі мяне дома няма.
Багаты Цімошка: сабака і кошка.
У каго чуюць, перад тым і шапкуюць.
Нам ні па чом сем карчом: абы грошы — усе абайдзём.
Казаў воўк, што гарох тоўк, авечак не чапаў, баран паверыў — і прапаў.

Шчупак за плоткаю ганяўся, пакуль сам у нерат не папаўся.

Свіння даўно паняй была б, але лыч не пускае

Жартаваў воўк з канём, ды ў жмені зубы панёс

ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИЕ ЕДИНСТВА СЛОВ

ДЕЙСТВИЕ

Вести себя несерьезно. *Валяць дурня*

Вести себя озорно. *Хадзіць на галаве*

Вести себя скрытно, не показываться. *Не казаць носа*

Выступать впустую. *Гаварыць на вецер*

Говорить несуразности, чушь. *Гарадзіць плот*

Действовать бессовестно. *Адбіраць у старца кій*

Действовать глупо. *Тварыць дурату*

Действовать криком. *Браць горлам*

Действовать напористо. *Даваць дыхту*

Действовать несерьезно и бессмысленно. *Зубы пра даваць*

Действовать рискованно. *Лезці (перці) на ражон*

Действовать старательно. *Вылузвацца са скуры, выцягвацца ў нітку*

Действовать с трагическим исходом. *Налажыць галавой*

Действовать широко, с размахом. *Варочаць светам*

Запомнить. *Запісаць сабе на лобе*

Исполнять чужую волю. *Скакаць пад чужую дудку*

Кричать. *Рваць горла*

Кричать сильно. *Крычаць дурным голасам*

Капризничать. *Выкідваць конікі*

Наговаривать невесть что. *Каціць бочкі арыштантаў*

Надоедать беспрестанно. *Не даваць збыту*

Надоедать сильно. *Давацца ў знакі*

Насмехаться, издеваться. *Строіць кпіны (кепікі)*

Обобрать обманом. *Абуць у лапці*

Обойти ловко. *Падцерці нос*

Осуществлять намерение расчетливо. *Падбіваць клінкі*

Оставлять решительно. *Атрасаць рукі*

Относиться подозрительно, недоброжелательно *Коса глядзець*

Переживать отчаянно. *Лезці на сценку*

Подстегнуть. *Падліць вару*

Подчинять своей воле. *Ездзіць вярхом*

Поступать безрассудно. *Спяшацца на шыбеніцу*

Потворствовать. *Даваць патолю*
Подгонять сильно. *Гнаць у карак*
Проявлять гостеприимство. *Разводзіць сталы*
Проявлять неблагодарность. *Забываць хлеб-соль*
Проявлять неверность, хитрить. *Віляць хвастом*
Проявлять своенравность. *Біць у хамут (аглоблі)*
Проявлять склонность к пьянству. *Глядзець у бутэльку*
Разбогатеть в трудных условиях. *Разжыцца на калу*
Развлекать разговорами. *Разводзіць лады*
Сделать невозможное. *Выламаць з калена*
Сделать для виду. *Здаць рад*
Смеяться злорадно. *Скаліць зубы*
Спутать в рассуждениях, при рассказе. *Збіць з тропу*
Стравить. *Звязаць хахлы*
Требовать решительно. *Прыставаць з кароткімі гужамі*
Убавить спеси. *Пазбіваць рогі*
Убежать. *Падмазаць пяткі*
Убежать стремительно. *Задаць лататы́*
Удрать. *Даць ходала*
Узнать случайно, неточно. *Пачуць адным вухам*
Уклони́ться от возвращения долга. *Накрыцца хвастом*
Унижаться. *Лізаць падмёткі*
Упрекать постоянно и грубо. *Есці поедам*
Упустить выгоду. *Даць зевака*
Утратить возможность воздействовать. *Насыпаць на хвост солі*
Учудить. *Умудрыць штуку*

СОСТОЯНИЕ

Бездельничать. *Біць байды, спраўляць лодара*
Быть в полном довольстве. *Есці на два бакі*
Быть во вражде. *Быць на нажах*
Быть на иждивении. *Сядзець на карку*
Быть очень похожим. *І бубкі падабраць*
Дрожать от холода. *Прадаваць дрыжыкі*
Заболеть, умереть. *Адкінуць капыты́ (хвост)*
Задумываться (очень). *Браць да галавы*
Заинтересоваться. *Пакласці вока, упасці ў вочы*
Не верить. *Не даваць веры*
Не появляться. *Не казаць вачэй*
Оживиться в росте (о растениях). *Падняць вушы*
Оказаться без средств существования. *Класці зубы на паліцу*
Оказаться в безвыходном положении. *Завязаць свет*

Оказаться в больших заботах. *Знайсці пятлю (хамут) на шыю*

Оказаться грубым, диким, невоспитанным. *Радзіцца ў лесе*

Оказаться обиженным случайно. *Трапіць пад злосць*

Отказаться навсегда. *Асінкаю заламаць*

Ощущать неловкость. *Свяціць вачамі*

Погибнуть. *Скруціць сабе галаву*

Прекратить рост, движение. *Сесці дзёўбам*

Просиживать в бездействии. *Аціраць вуглы*

Сильно устать. *Упасці з капылля далоў*

Смеяться (очень). *Класціся (класціся покатам, душыцца) са смеху*

Сожалеть. *Чухаць патыліцу*

Стать богачом. *Наесці чэрава*

Стать недовольным. *Закапыліць вусны (губы)*

Страдать. *Біцца галавой аб сцяну*

Удивляться. *Давацца дзіву*

Упускать выгоду. *Спаць у шапку*

Утратить способность соображать. *З'ехаць з глузду*

ОБСТОЯТЕЛЬСТВА

Без причины (пострадать). *Ні за што ні пра што, за нішто ніякае*

Безоглядно (бежать). *На злом галавы*

Безоговорочно (исполнить). *Каб слова, каб слова сказаў, да словечка*

Без свидетелей (поговорить). *З вока на вока*

До конца жизни (помнить, быть). *Да веку, да скону*

Задевая друг друга словами (начать). *Слова за слова*

За ничто (работать). *На дурніцу*

Кое-как (сделать). *Абы з рук*

Неопределенно (иметь положение). *Ні дома, ні замужам*

Неопределенно (находиться в состоянии). *Ні тпру, ні но*

Неопределенно (вести себя). *І нашым і вашым*

Непосредственно (встретиться). *Нос у нос*

Не так (делать кому-то). *Не ў лад*

Не удостоив взглядом. *Каб паглядзеў*

Одиноко (проживать). *Сам сабе, сам сабой, сам-насам*

С большими усилиями, по принуждению (заставить пойти, сделать, начать). *З крыкам, з гвалтам*

ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИЕ ПРЕДЛОЖЕНИЯ

Безнадежность объяснений и доказательств. *(Яму, ёй, ім...) свайго розуму не ўкладзеш.*

Бесстыдство в действии, поведении. *(Для гэтага...) трэба вочы ў сабакі пазычыць.*

Бессодержательность высказывания, речи, сообщения. *Гэта лухта непадсяваная.*

Болтливость. *(У яго, яе...) не замерзне на языку.*

Быстрота и энергичность в поведении. *На ім скура гарыць.*

Голодное состояние. *(Ім, вам...) жываты падвяло, бакі ўвабрала.*

Дрожь при ощущении холода. *(У яго, у мяне...) зуб на зуб не трапляе, зуб зуба даганяе.*

Заносчивость. *(У яго, яму, у яе...) крукам (кукішам) носа не дастанеш.*

Инициативность в начинаниях. *(З яго, яе...) свет гарыць.*

Крепкая дружеская деловая связь. *(Іх, вас...) вадой не разальеш.*

Малозначительность. *Ад бочкі за́ткала (шпунт).*

Малорослость. *(Ён, яна...) яшчэ кату па пяту.*

Медлительность. *(Яго, цябе, вас...) толькі па смерць пасылаць.*

Неблагоприятность. *(Сёлета, летась) не год (быў) на садавіну (ягады...).*

Нежелание признать то, что было. *(Яму, табе...) памяць адсохла.*

Необходимость только отбыть время. *Абы дзень да вечара (нам, табе...).*

Неодолимое желание. *(У яго...) вока гарыць на (гэта...).*

Неравенство. *(Ты яму, ён табе...) не вярста.*

Неспособность ни к чему. *(Ён...) ні да танца, ні да ружанца.*

Никчемность. *(Ён, ты...) сабакі не варт.*

Одинаково плохо. *Не кіем, дык палкаю.*

Отсутствие времени. *(Мне, яму...) некалі дыхнуць.*

Отсутствие внимания. *(Мне, ёй...) не ў голаў (не ў галаву, не ў галаве).*

Отсутствие признаков существования. *(Тут іх, яго; там іх, яго) і за́ваду няма (не было).*

Отсутствие признаков пребывания. *Не засталося і звання (яго, іх...); (яго, іх) і след прастыў.*

Отсутствие чего-либо значимого. *Тут ні ўцяць, ні ўзяць.*

Очень раннее время суток. *Яшчэ чэрці на кулачкі не браліся.*

Очень большая худоба. *(У яго, у яе...) адны вочы засталіся.*

Ощущение немощи, старости. *Быў конь, ды з'ездзіўся.*

Подвижность, непоседливость. *(Ён, яны...) тут ёсць, тут няма.*

Полная подчиненность. *(З яго, з яе) вяроўкі ўюць.*

Полное сходство. *(Яны) на адзін капыл, абое рабое.*

Поспешное бегство. *(Я, ён) лахі пад пахі і ходу.*

Проявление зависти. *(Яго, мяне...) завідкі бяруць.*

Преступные склонности. *(Па табе, па ім...) вяроўка (шыбеніца, турма) плача.*

Пьянство. *У яго глотка не прасыхае; ён не прасыхае.*

Сильное неудовольствие тем, что увидел. *Вочы б мае не бачылі.*

Сознательная бездеятельность. *(Ён) палец аб палец не ўдарыць.*

Умственная слабость, пустота. *У яго салома (мякіна) у галаве.*

СРАВНЕНИЯ

О ДЕЙСТВИЯХ

Бежит. *Бяжыць (нясецца), як падпалены, як падсмажаны, як шалёны* (очень поспешно, быстро).

Бродит. *Блукае (бродзіць, блындае), як цень, як здань, як свет згубіў* (в полном расстройстве).

Вертит. *Круціць носам, як сабака каля разніцы* (обращает особое внимание, проявляет повышенный интерес).

Вертится. *Круціцца, як голы ў мурашніку, у крапіве* (в трудном положении); *выкручваецца, як скурат на агні* (изворачивается в безысходной ситуации).

Выскочил. *Выскачыў, як Пілін з каноплаў (канапель), як з каноплаў* (высказался невпопад).

Говорит. *Гаворыць, як п'яны плот гародзіць* (бессвязно); *як стары дзед кашалі пляце* (небылицы); *балбоча, як індык, як цецярук* (говорит много); *бубніць, як удод* (говорит невразумительно, глухо); *барабаніць, як пустая бочка* (говорит бессодержательно, много); *брэша, як сабака на вецер* (врет); *голіць, як брытва* (говорит остро, резко).

Копается. *Капаецца, як сляпы ў торбе* (бестолково)

Кричать. *Крычы, хоць разарвіся, хоць лопні* (о невнимании к тому, кто кричит).

Кричит. *Крычыць, як варона на дождж* (упорно), *аж сцены разлягаюцца* (сильно), *хоць вушы затыкай* (пронзительно); *вішчыць, як парася ў прасле* (отчаянно).

Лезет. *Лезе, як дым у вочы, сляпіцаю* (неотвязно).

Наскочить. *Нарваўся, як голы на бізун* (о неприятностях).

Настращать. *Напужаў, як ката скваркаю* (о достижении обратного результата).

Оглядываться. *Азіраецца, як парася ўкраў* (с опасением, страхом).

Плавает. *Плавае, як сякера, як калун* (о неумении плавать), *як качка* (об умении плавать).

Поехать. *Паехаў — як камень у ваду боўкнуў* (об отсутствии вестей).

Посмотреть. *Глянуў — як капейку даў* (о приятном ощущении от взгляда).

Привязаться. *Прыстаў, як сляпы да плоту* (неотвязно)

Делает. *Робіць, як назаўтра трэба, як не сваімі (рукамі), як сырое гарыць* (медленно).

Делят. *Дзеляць, як Тодар з Тадораю лапаць з аборaю* (шутка о бессмысленном, глупом дележе).

Дерутся. *Б'юцца, як пеўні* (шумно наскакивая друг на друга)

Добраться. *Дабраўся, як вол да брагі* (о жадности).

Дружно. *Дружна, як жабы на дождж* (все вместе).

Ест. *Есць, як не ў сябе* (много), *як за сябе* (быстро), *як тыдзень не еўшы* (жадно), *аж нос гнецца* (с охотой), *аж за вушамі трашчыць* (старательно), *як нежывы, як не сваімі* (без охоты, лениво).

Заговорить. *Загулі, як пчолы ў вуллі, як у купіне чмялі* (о шуме от разговоров).

Идти. *Валюхаецца, як качка* (идти тяжело, раскачиваясь в стороны); *пайзе, хоць вáру падлі* (идти медленно); *валачэцца, як сабака за возам* (идти без желания).

Сказать. *Сказаў, як у сук уляпіў, як звязаў* (точно), *як пугаю па вадзе* (бессодержательно), *як сабака «гаў»* (грубо, лживо); *ляпнуў, як гразёю ў вочы* (грубо, оскорбительно)

Смотрит. *Глядзіць, як вол на новыя вароты* (удивленно и тупо)

Танцуют. *Скачуць, як голыя ў крапіве* (беспорядочно и дико)

Угождать. *Дагаджаў, як ліхой скуле* (обходился очень осторожно).

Хозяйничать. *Гаспадарыць, як свіння ў агародзе* (безобразно)

Храпит *Храпе, як карчы дзярэ* (звучно)

О СОСТОЯНИИ

Бедный. *Гол, як сакол.*

Богатый. *Багаты, як чорт рагаты.*

Болят. *Баляць, як сабакі рвуць* (о ногах)

Бьется. *Б'ецца, як рыба аб лёд* (о горе)

Везет. *Шанцуе, як тапельцу, як вісельніку* (о невезении).

Глухой. *Глухі, што пень, як цяцера, як сцяна*

Горе. *Бяда, хоць воўкам вый, хоць у пятлю лезь, хоць у труну лажыся, хоць з моста ў рэчку.*

Деньги. *Грошай, як мякіны* (много), *хоць сцены клей* (много), *каб капейка, шэлег* (мало)

Дрожит *Дрыжыць (трасецца), як авечы хвост, як асінавы ліст* (от холода, со страха)

Живет. *Жыве, як у Бога за плячыма* (беззаботно), *як сарока на калу* (без пристанища).

Живется. *Жывецца, як валу ў ярме* (трудно), *як кату* (комфортно), *як бяздомнаму сабаку* (голодно и неуютно)

Здоровый. *Здаровы, хоць у плуг запрагай, як бык, як вол, як дуб.*

Лежит. *Ляжыць, як лут, як калода, як падла, крыцаю, лежнем.*

Любит *Любіць, як сабака палку* (опасается)

Молчит. *Маўчыць, як сцяна, як вады ў рот набраў*

Одинокий. *Адзін, што пень, як палец, як былінка ў полі*

Пьяный. *П'яны, як гразь, як зямля, як свіння; набраўся, як жаба гразі, як зямля.*

Расти. *Растуць, на лес гледзячы* (о детях)

Свыкся. *Звыкся з бядою, як рыба з вадою.*

Сильный. *Дужы, як свіння ў лужы* (шутка)

Сидит. *Сядзіць, як мыш пад венікам, пад мятлой* (о пребывании в страхе)

Трудно, тяжело. *Мне, як таму, што зямля на ямў*

Ушел. *Пайшоў, як мыла з'еўшы* (о решительном выпровождении)

Хочется. *Хочацца, як каню ў аглоблі* (о нежелании)

О ВНЕШНОСТИ

Бледный. *Белы (збялеў, збялела), як снег, як палатно, як папера, як смерць.*

Борода. *Барада, як памяло* (широкая), *як мятла* (длинная).

Глаза. *Вочы, як у злодзея* (воровские).

Голова. *Галава, як гарбуз, кацёл* (большая), *як калена* (голая, бритая), *як у барана* (курчавая).

Зарос (волосами). *Аброс, як воўк.*

Испачкался в грязи. *Выкачаўся, як свінчо; брудны (мурзаты), як парася, як еў з парасятамі* (о лице).

Красивая (с лица). *Прыгожая, хоць вады напіся з твару.*

Красный. *Чырвоны, як рак* (от стыда).

Кудрявый. *Кучаравы, як баран.*

Не по фигуре (одежда). *Вісіць, як на калу.*

Подходит по фигуре (костюм). *Сядзіць (ляжыць), як уліты.*

Разодетая. *Прыбраная (прыбралася), што лялька.*

Темный (с лица). *Чорны (счарнеў), як галавешка, як засланка* (по природе).

Худой (исхудал). *Высах, хоць рэбры лічы, што трэска, на трэску.*

О ЯВЛЕНИЯХ ВНЕШНЕГО МИРА

Близко. *Блізка, як рукой падаць* (совсем недалеко).

Видно. *Відна, як удзень; хоць іголкі збірай* (о ясной лунной ночи зимой).

Вода. *Вада, як лёд* (холодная).

Гора. *Гара, як з печы* (обрывистая).

Грибы. *Грыбоў, хоць касі, хоць касу закладай* (очень много).

Деньги. *Грошы, як вада* (о несохранности денег).

Дождь. *Дождж, як з цэбра, як з вядра, як з луба* (о ливне).

Дом. *Хата, як хлеў, як гумно* (большая и пустая), *як катух, як будка, як кучка* (маленькая и тесная); *у хаце хоць ваўкоў ганяй* (холодно).

Дорога. *Дарога, хоць бокам каціся, як яйцо* (гладкая), *як палатно* (ровная), *як страла* (прямая).

Дуб. *Дуб, аж шапка валіцца* (высокий).

Жара. *Вáрыць, як у катле* (парно); *пячэ, аж смыліць* (жарко).

Земля. *Зямлі, як старой бабе сесці* (мало).

О ВНЕШНОСТИ

Бледный. *Белы (збялеў, збялела), як снег, як палатно, як папера, як смерць.*

Борода. *Барада, як памяло* (широкая), *як мятла* (длинная).

Глаза. *Вочы, як у злодзея* (воровские).

Голова. *Галава, як гарбуз, кацёл* (большая), *як калена* (голая, бритая), *як у барана* (курчавая).

Зарос (волосами). *Аброс, як воўк.*

Испачкался в грязи. *Выкачаўся, як свінчо; брудны (мурзаты), як парася, як еў з парасятамі* (о лице).

Красивая (с лица). *Прыгожая, хоць вады напіся з твару.*

Красный. *Чырвоны, як рак* (от стыда).

Кудрявый. *Кучаравы, як баран.*

Не по фигуре (одежда). *Вісіць, як на калу.*

Подходит по фигуре (костюм). *Сядзіць (ляжыць), як уліты.*

Разодетая. *Прыбраная (прыбралася), што лялька.*

Темный (с лица). *Чорны (счарнеў), як галавешка, як засланка* (по природе).

Худой (исхудал). *Высах, хоць рэбры лічы, што трэска, на трэску.*

О ЯВЛЕНИЯХ ВНЕШНЕГО МИРА

Близко. *Блізка, як рукой падаць* (совсем недалеко).

Видно. *Відна, як удзень; хоць іголкі збірай* (о ясной лунной ночи зимой).

Вода. *Вада, як лёд* (холодная).

Гора. *Гара, як з печы* (обрывистая).

Грибы. *Грыбоў, хоць касі, хоць касу закладай* (очень много).

Деньги. *Грошы, як вада* (о несохранности денег).

Дождь. *Дождж, як з цэбра, як з вядра, як з луба* (о ливне).

Дом. *Хата, як хлеў, як гумно* (большая и пустая), *як катух, як будка, як кучка* (маленькая и тесная); *у хаце хоць ваўкоў ганяй* (холодно).

Дорога. *Дарога, хоць бокам каціся, як яйцо* (гладкая), *як палатно* (ровная), *як страла* (прямая).

Дуб. *Дуб, аж шапка валіцца* (высокий).

Жара. *Ва́рыць, як у катле* (парно); *пячэ, аж смыліць* (жарко).

Земля. *Зямлі, як старой бабе сесці* (мало).

Всегда, во все времена. *Век-вяком*

В том-то и дело. *У тым і штука*

В шутку. *Смехам, на смех*

В этом году. *Сёлета*

Высказывать свое мнение. *Выказваць сваю думку*

Говоря вообще. *Агулам кажучы*

Да и только. *Дый годзе*

Да уж. *Ды ўжо ж*

Держать пари. *Ісці ў заклад*

Держать себя молодцом. *Трымацца зухам*

Держать себя независимо. *Трымацца незалежна, вольна*

Держать слово. *Стаяць на слове*

Для вашей же пользы. *Вам жа спажытак*

Днем и ночью. *Удзень і ўночы*

До будущего года. *Да налецця*

Достойный уважения. *Годны павагі, варты павагі*

Друг друга. *Адзін аднаго, адна адну, адно аднаго* (при существительных мужского и женского рода)

Другими словами. *Іначай кажучы*

Другое дело. *Іншая справа*

Едва не... *Ледзь не... За малым не..*

Ежедневно. *Штодзень, штодня, штодзённа, дзень пры дні*

Ежегодно. *Штогод, штогоду*

Ежемесячно. *Штомесяц, штомесячна*

Ежеминутно. *Штомінутна, штохвілінна, кожную мінутку (хвілінку)*

Еженедельно. *Штотыдзень, штотыдня, штотыднёва*

Ежесекундно. *Штохвілінна*

Ежесуточно. *Кожныя суткі*

Ежечасно. *Штогадзінна, штогадзіны*

Ему-то что! *А што яму!*

Ему удобно. *Яму зручна, яму рука*

Ему неудобно. *Яму нязручна, яму не рука*

Если бы знать! *Каб жа ведаць! Каб жа знаццё!*

Еще бы! *Чаму не! Чаму б не!*

Жив-живехонек. *Жыў-жывюсенек*

Загребать деньги. *Аграбаць грошы*

За день (ночь). *Абдзень (абноч), абыдзень*

Заискивать перед ним. *Паддобрывацца пад яго, запабягаць перад ім*

Закружилась голова. *У галаве закруцілася*

Заморить червяка. *Прагнаць голад*

Заслуживающий доверия. *Годны веры*

Затянуть песню. *Завесці песню*
Захватило дыхание. *Дух заняло*
Зачем это? *Навошта гэта?*
Знаешь ли?.. *Ведаеш?..*
Знать понаслышке. *Ведаць з чутак*
Зубоскалить. *Галіць зубы*
И в ус не дует. *І не шманае*
Идти проторенным путем. *Ісці езджанай дарогай*
Измотать. *Вынясць духі, змардаваць*
Испытать горе. *Прыняць гора, перажыць гора*
И тот, и другой. *І адзін і другі*
Как должно быть. *Як мае быць*
Как говорится... *Як той казаў...*
Как можно (лучше). *Як мага (лепш)*
Как ни в чем не бывало. *Як нічога не было, як ніколі нічога, як нідзе нічога*
Какое тебе дело! *А табе што! А што табе за клопат!*
Какое-то время. *Якую часіну, нейкую часіну*
Какой угодно. *Які хочаш*
Как пришлось. *Як трапляла*
Как с иголочки. *Як з іголкі зняты*
Как следует. *Як мае быць*
Как только возможно. *Як мага*
Как-то так. *Неяк, якся*
Как угодно. *Як хочаш (хочаце)*
Клонить (склонять) к тому. *Гнуць (вярнуць, хіліць, весці) да таго*
Кому угодно. *Каму хочаш*
Копия отец (мать). *Выкапаны бацька (маці)*
Кричать, не прекращая. *Крычма крычаць*
К слову пришлось. *З гаворкі выйшла*
Кстати говоря... *Да слова кажучы...*
Куда глаза глядят. *У свет*
Куда деваться. *Куды падзецца*
Куда угодно. *Куды хочаш*
К черту на кулички. *На край свету, за свет*
Лежать, не поднимаясь. *Лежма ляжаць*
Лишиться сознания. *Страціць прытомнасць*
Лишиться чувств. *Самлець*
Ломиться в открытую дверь. *Біцца ў адчыненыя дзверы*
Мало ли что... *Мала што...*
Маменькин сынок. *Мамчын сынок*
Между тем... *Тым часам...; між тым...*
Метко сказано. *Трапна сказаў; сказаў, як звязаў*
Мне недосуг. *Мне няма часу, няма калі*

Мне не нравится. *Мне не падабаецца, мне не даспадобы, я не ўпадабаў*

Мне нравится. *Мне падабаецца, я ўпадабаў*

Набитый дурак. *Дурань з дурняў*

Набить оскомину. *Нагнаць аскому*

Набить руку. *Налаўчыцца*

На всякий случай. *На той час (выпадак), як спатрэбіцца*

Надо же! *І собіла ж!*

На куски. *У мэтлахі*

На мелкие части. *У друзачкі*

На посошок. *На адходную*

На развод. *На завод*

На что же это похоже! *Да чаго ж гэта падобна! Куды ж гэта варта!*

Неважно. *Бяды, такой бяды*

Не впервые, не впервой. *Не першыня*

Не давать покоя. *Не даваць збыту*

Не за что. *Няма за што*

Некогда. *Няма калі*

Некуда. *Няма куды*

Невозможно выдержать. *Нельга вытрываць, зусім няўцерп*

Не могу поверить. *Не йму веры*

Не на что (смотреть) *Няма на што (глядзець)*

Не поминайте лихом. *Не ўспамінайце благім словам*

Несмотря на... *Не зважаючы на (што)..; дарма што..*

Нет избавления. *Няма збыту*

Нет ничего удивительного. *Няма дзіва; няма ніякага дзіва*

Неужели? *Няўжо? Няго не...?*

Ни зги не видно. *Цёмна, хоць вока выкалі*

Ни капельки. *Ні каліва*

Ни к чему. *Ні да чаго*

Ничего не понятно. *Нічога не зразумець*

Ничуть не. *Ніяк не, ні звання не*

Ни смысла, ни порядка. *Ні складу, ні ладу*

Ни то, ни другое. *Ні сёе, ні тое*

Ни шиша не получишь. *Фігу атрымаеш*

Ну да, разумеется. *А ўжо ж так; але*

Обеими руками. *Аберуч, аберучкі*

Обратить внимание. *Звярнуць увагу, узяць пад увагу, мець на ўвазе*

Однажды. *Аднаго разу, аднойчы*

Одно удовольствие! *Любата адна!*

Оказать помощь. *Дапамагчы, даць (накіраваць) дапамогу*

Орать дико. *Крычаць нема (нямым голасам)*

Остаться в живых. *Застацца жывым*

Откуда-то. *Аднекуль, са свету*

От ужаса. *З жаху*

Очень редко. *Гады ў рады*

Паче чаяния. *Чаго добрага, неспадзёўкі*

Пить, наклонив посудину. *Піць нагбом; набгом*

Плыть по течению. *Плыць з вадою*

По вашей милости. *З вашае ласкі*

Поверишь ли... *Ці дасі веры...*

По глупости. *Здуру*

Поддать жару. *Паддаць духу*

Под гору (идти). *З гары* (ісці)

Подобным образом. *Падобным парадкам*

Под одну меру. *На адзін капыл*

По принуждению. *З-пад прынукі (прысілу)*

Поймать живым или мертвым. *Злавіць жывога ці мёртвага*

Пойти на хитрость. *Пусціцца на хітрыкі*

По мне, как хотите. *З майго боку, дык як хочаце; як да мяне, дык як хочаце*

По неведению. *З няведання*

По причине. *З прычыны*

Попутно. *Па дарозе*

После обеда (ужина). *Па абедзе (вячэры)*

Почему бы и нет. *А чаму ж бы*

Предать забвению. *Пусціць у забыццё*

Прежде всего. *Перш-наперш*

Привыкнуть к людям. *Абыцца з людзьмі*

Прижить ребенка. *Дабыць дзіця*

Прийти в себя. *Агойтацца, ачуцца*

Прийти в чувство. *Ачуцца, ачухацца*

Приносить пользу. *Даваць карысць*

Проводить время в бездействии. *Гульма гуляць*

Про запас. *У запас*

Проявлять самостоятельность. *Паказваць самастойнасць, вольнасць*

Пускать слова на ветер. *Гаварыць на вей-вецер*

Пусть Бог сохранит *Хай Бог ратуе*

Ради чего? *Дзеля чаго?*

Разве это впервые? *Ці ж гэта першыня?*

Сделать круг. *Даць круга*

Сидеть, не поднимаясь. *Седзьма сядзець*

Сколько угодно. *Колькі хочаш*
Слава Богу. *Хвала Богу*
Сложить голову. *Пакласці галаву*
Слышать нюхом. *Духам чуць*
Слышать своими ушами. *Чуць на свае вушы*
Смотри! *Пабач!*
Смотри-ка! *Бач ты!*
Смотря как. *Як паглядзець*
Смотря по настроению. *Як да настрою*
Совершенно всё. *Усё чыста*
Совершенно ни за что. *Ні за што ні за якое*
Совершенно никого. *Ані нікога, анікога*
Стало быть... *Знакам тым...*
Столько времени... *Цеперся...*
Сторонись! *Набок!*
Так и быть! *Такой бяды!*
Таким образом. *Такім чынам, парадкам*
Таким порядком. *Гэткім парадкам*
Такой-то. *Такі і такі*
Творить молитву. *Чыніць малітву*
Творить чудеса. *Чыніць дзівы*
Тем паче. *Тым больш*
Тогда как... *Тым часам як...; у той час як...*
Тогда-то. *Тады і тады*
То и дело. *Раз за разам*
Трын-трава. *Хоць што; хоць бы што*
Ты прав. *Твая праўда*
Упасть в обморок. *Самлець*
Установиться хорошей погоде. *Стаць на пагодзе*
Утолить жажду. *Прагнаць смагу*
У черта на куличках. *За светам*
Хлеба на корню. *Збожжа на пні*
Холодно ногам. *Холадна ў ногі*
Хоть бы что. *Каб што*
Христа ради. *Дзеля Хрыста*
Часто смотреть в ожидании. *Прагледзець вочы, чакаючы*
Человеческое достоинство. *Людская годнасць*
Чин чином. *Як трэба*
Что за беда. *Такой бяды, бяды*
Что касается меня, то... *Што да мяне, то... Як да мяне, то...*
Что угодно. *Што хочаш (хочаце), што маеце да мяне (да нас), чаго трэба...*
Этого числа. *Гэтага дня*

Это ж надо! *Трэба ж так!*
Это-то и нужно было. *Дык гэта і трэба было*
Я прав. *Мая праўда*

ПЕРИФРАЗЫ

Арктика. *Сусветны халадзільнік*
Беларусь. *Край блакітных азёр*
Береза. *Беластволая прыгажуня*
Боровик. *Грыбны кароль, грыбная знаць*
Вагон. *Вандроўны дом, дом на колах*
Весна. *Маладосць зямлі*
Водка. *Злое зелле*
Война. *Крывавая завіруха*
Вспомнить. *Прыйсці на памяць, паварушыць памяць, вярнуцца ў памяць*
Выпить. *Падняць апетыт, павесяліць душу, заглянуць у бутэльку*
Говорить. *Ткаць словы*
Город. *Каменны лес, людскі мурашнік*
Гречиха. *Паўночны рыс*
Дети. *Будучыня свету*
Дождь. *Веснавое пітво*
Думать. *Сназаць думкі*
Жена. *Сяброўка жыцця*
Жизнь. *Жыццёвае мора*
Жыць. *Таптаць дарогі, гнаць век*
Запомнить. *Запісаць у памяць*
Зеленеть. *Апранацца ў зеляніну*
Зубр. *Гаспадар пушчы, пушчанскі цар*
Земля. *Вечная карміцелька*
Картофель. *Другі хлеб*
Кот. *Тыграў сваяк*
Конфеты. *Дзявочая прынада*
Кукушка. *Вястунка год, баравая варажбітка*
Лес. *Зялёнае мора, зялёны сябра*
Луч. *Асколак сонца*
Любовь. *Сардэчны пажар*
Лен. *Беларускі шоўк*
Медики. *Людзі ў белых халатах*
Меха. *Мяккае золата*
Молиться. *Гаварыць з Богам, дзерціся на неба* (неодобр.)
Молодость. *Вясна жыцця, раніца жыцця*
Морщины. *Вестуны старасці*

Наркотики. *Белая смерць*
Нарочь. *Беларускае мора*
Небо. *Блакітная бездань, пяты акіян*
Нефть. *Чорнае золата*
Нравиться. *Прыпадаць да сэрца*
Осудить. *Пасадзіць на казённы хлеб*
Отечество. *Край бацькоў, зямля бацькоў*
Очки. *Шкляныя колы*
Партызаны. *Лясныя рыцары*
Пасека. *Пчаліны гарадок*
Писать. *Кіраваць пяром, псаваць паперу* (плохо писать)
Прожить. *Працерці век*
Пройти. *Адмераць нагамі*
Птицы. *Веснавыя госці*
Пчолы. *Крылатыя працаўнікі*
Реакция. *Палітычны мароз*
Родить. *Даць жыццё, пусціць на свет*
Самолет. *Жалезная птушка*
Свекла (сахарная). *Салодкі корань*
Смерть. *Бязносая пані, кашчавая бабуля*
Смеяться. *Сушыць зубы*
Снег. *Белыя мухі, белы пух, белая коўдра*
Сова. *Крылатая кошка*
Старость. *Захад жыцця*
Суббота рабочая. *Чорная субота*
Табак. *Праклятае зелле*
Торф. *Карычневае золата*
Трактор. *Сталёвы конь*
Ударить. *Паправіць партрэт*
Улыбнуться. *Расцвісці ўсмешкай*
Умереть. *Выбрацца на пагост*
Утонуть. *Пакарміць рыб*
Учиться. *Грызці навуку*
Фашизм. *Карычневая чума*
Храпеть. *Прадуваць сапло*
Человек. *Сын Зямлі, вянец прыроды*
Черт. *Князь цемры, балотны пан*
Юбилей. *Вясёлая рэпетыцыя хаўтураў*

АФОРИЗМЫ

А там, за светам, на чужыне
Ніхто цябе, ой, не прыхіне! *(Я. Колас)*

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы. *(Я. Купала)*

Ад вёскі адбіўся, у палац не папаў *(Я. Купала)*

Ад славы галава не баліць, а толькі кружыцца. *(І. Гурскі)*

Ад зямлі да зор і сонца
Няма думкам забаронцы *(Я. Колас)*

Дрэнна маё жыцце,
Ўсё ідзе не ў лад,
І крычаць мне ўсюды:
«Асадзі назад!» *(Я. Колас)*

Без повада, без вобруці,
Усім вядома, добра йсці. *(Я. Колас)*

Браток! Ці жа вачэй не маеш —
Арлом варону называеш? *(М. Багдановіч)*

Будзь смелы, як вецер, як воля сама!
Знай, смелых не чэпе ні крыўда, ні цьма! *(Я Купала)*

Бурай змецёнае лісце
Не вяртаецца на голле. *(П. Панчанка)*

Была б свіння, а лужа будзе. *(У. Корбан)*

Быў бы талент — знойдзецца пасада *(А. Русецкі)*

Воля сонейку раўня. *(Я. Купала)*

Вучыся, нябожа, вучэнне паможа
Змагацца з нядоляй, няволяй. *(Я. Купала)*

Гора не сціхне ад слоў. *(Я. Колас)*

Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах. *(К. Крапіва)*

Дзень вяселля назначылі,
Ды вяселля не бачылі. *(Я. Колас)*

Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш. *(Я. Колас)*

Другі баран — ні «бэ», ні «мя»,
А любіць гучнае імя. *(К. Крапіва)*

Дык не гаруй жа, брат-нябога:
Дзянькоў вясёлых яшчэ многа! *(Я. Колас)*

За шкурку плоціць тхор галоўкай. *(Я. Колас)*

Забілі зайца, не забілі,
Але ж, брат, гуку нарабілі. *(Я. Колас)*

Здэцца, й робяць яны штось,
Але справы — слабы. *(К. Крапіва)*

І авечка, хоць дурная,
А ваўка ж пазнае. *(Ф. Багушэвіч)*

І воўк жа не цягаецца вечна адзін. *(К. Чорны)*

І Зоя — не тое,
І Насця — не шчасце. *(П. Панчанка)*

І прад такім, вось, галамоўзай
Не смей стаць роўна ты, а поўзай. *(Я. Колас)*

І ў самай большай на свеце пасудзіне ёсць дно. *(К. Чорны)*

Казырнуў не яму, а партфелю. *(А. Куляшоў)*

Калі розум слабаваты,
Не віні падкоўкі. *(М. Лужанін)*

Кіраваць то ты кіруй,
Ды не вельмі тузай. *(К. Крапіва)*

Крыкі спрэчкі не развяжуць. *(Я. Колас)*

Людзей смяшы, а сам не смейся. *(Я. Брыль)*

Мне Загібелька лепш Парыжа. *(Я. Колас)*

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы! *(Я. Колас)*

На беларускую дзяўчыну
